ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год. выд. 32-й
№ 48 (1789)
14 чэрвеня 1963 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЁННЯ

ВЫ ПАЧУЕЦЕ ПА РАДЫЁ ЦІ ПРАЧЫТАЕЦЕ Ў ГАЗЕЦЕ...

СЁННЯ БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ І ГАЗЕТА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА» ПРАВОДЗЯЦЬ РАДЫЁДЗЕНЬ «ЖЫВЫЯ РЫСЫ КАМУНІЗМА», ПРЫСВЕЧАНЫ НАДЫХОДЗЯЧАМУ ПЛЕНУМУ ЦК КПСС.

Артыкулы, нарысы, рэпартажы, выступленні пісьменнікаў і журналістаў расказваюць пра душэўнае хараство і багацце нашага сучасніка

Сярод радыёперадач і матэрыялаў, змешчаных на старонках газеты:

выступленне Уладзіміра Карпава «Мара становіцца явай»;

выступленне Уладзіміра Дадзіёмава «Стаўка на давер'е»;

артыкул Анатоля Вялюгіна «Дарога без прывалу»;

нарыс Георгія Загародняга «А песня ад сэрца...»;

выступленне Генадзя Бураўкіна «Чалавек — чалавеку»;

нарыс Уладзіміра Мехава «Аляксандр Хабараў, буравік»;

расказы Рамана Сабаленкі, Анатоля Вярцінскага і Генадзя Бекарэвіча пра сустрэчы з цікавымі людзьмі;

артыкул Алены Уладзіміравай «Дзве візітныя карткі»;

заметкі «Гераічнае — побач»;

вершы, песні, канцэрт па заяўках герояў радыёдня.

ЗВЯРАЮЧЫ СВАЕ ПАЧУЦЦІ...

Раман САБАЛЕНКА

Я прыехаў у сваю родную вёску і неяк аж разгубіўся нават: яна зусім інакшая, чым я насіў дагэтуль у думках, у сэрцы, у пачуццях. Яна не тая не толькі ў сваім знешнім абліччы... Яна не тая неяк унутрана, не тая ў людскіх намерах і марах, у людскіх думках. Калісь, яшчэ ў пару майго юнацтва, думкі не сягалі далей свайго двара, вуліцы, далей нейкага прымітыўнага дабрабыту, яны як бы былі стрыножаныя дробным капеечным клопатам. Цяпер жа, углядаючыся ў жыццё, бачым, наколькі яно стала складанейшым, і не толькі тым, што ў яго ўварваўся машынны гул, што замест палольшчыцы на ільняным загоне, якая, раздзіраючы да крыві рукі, вышчыпвала пальцамі кожную пустазеліну, нізка над палеткам ледзь не чапляючыся коламі зямлі лятаюць крылатыя палольшчыкі... Складанасць жыцця прайшла праз людскія душы і сэрцы, якія абудзіліся для новай і да новай явы. Паявілася нават у тых людзях, якіх ты ведаў з год свайго маленства, нешта новае і на першы погляд незразумелае, і ты не ведаеш, як яго прыняць, як яго ацаніць, на які, як кажуць тыя бухгалтары, рахунак яго залічыць.

Пісьменніку цяпер цяжка з першага погляду зразумець нават тое, што яшчэ колькі год назад здавалася такім простым і зразумелым. З маленства я ведаў дзядзьку Паўла Зелянкоўскага. Гэты працавіты, як казалі на яго, двухжыльны чалавек, яшчэ не ведае ў працы стомы. Ён і цяпер, не зважаючы на тое, што ўжо з жыццёвага рахунку спісвае сёмы дзесятак год, яшчэ не старэе ў працы, яго вузлаватыя дужыя рукі не баяцца мазаля, але ў той жа час яны на яго і не кідаюцца.

— Цяпер што, — кажа дзядзька Павел, — цяпер жытка такая настала, што жывучы, красавацца можна. Гэта не тое, што колісь убіваўся ў працы, як той чорны вол у баразне, і не вельмі што і меў. Цяпер мы жывём, можна сказаць, прыпяваючы.

І от, каб зразумець душу старога чалавека, які пачаў «жыць прыпяваючы», які не хоча старыцца, трэба зірнуць у самыя глыбіні людской душы. А з людской душы зрабіць вывады — гэта не эканамічнай выкладкі. Людская душа глыбейшая, складанейшая, танчэйшая, і для таго, каб яе зразумець, трэба працяцца яе клопатам. А гэта не так лёгка. Тут патрэбен добры і чулы дарадца. І кожны з нас мае такога дарадцу. І не аднаго.

Мне здаецца, што кожны пісьменнік мае не толькі сваю тэму, але і свой унутраны аб'ект. Я, напрыклад, пра што б ні пісаў, заўсёды прыкідваю на сваю вёску, на людзей, з якімі жыў і сябраваў яшчэ ў маленстве. І не дзіва, што ў вобразах маёй трылогіі «Іду ў жыццё» некаторыя з маіх аднавяскоўцаў пазналі сябе і нават пакрыўдзіліся, хоць я быў далёкі ад таго, каб іх зняважыць. Я проста пісаў з іх партрэты, яны былі ў некаторай меры натуршчыкамі, і мо таму пазналі сябе. Але натуршчык натуршчыкам. Гэта для знешняга падабенства. А от падабенства ўнутранае, падабенства жывога чалавека — гэта больш складанае, асабліва цяпер, калі самі людзі сталі больш складанымі, я сказаў бы, нейкімі «сінтэтычнымі», яго трэба звяраць як найпільней з аб'ектам, звяраць самім жыццём. І вось гэтая зверка жыццём дужа складаная. Тут пісьменніку абавязкова трэба мець дарадцу душы, чалавека, які б верыў табе і якому б верыў ты. Без такога чалавека нельга абысціся, каб не маляваць з першага позірку, калі часам і не вельмі прывабнае здаецца выключным. Такім чалавекам, такім дарадцам я лічу свайго земляка, даволі вядомага чалавека, старшыню калгаса, майго аднафамільца Івана Лявонавіча Сабаленку. Няхай яго трошкі закранула пачуццё самалюбавання, самазахаплення — гэта ад поспехаў, але пісьменнік павінен быць веяльшчыкам, каб адвеяць пустыя зярняты ад поўных і поўнымі засеяць ніву свайго твора.

Іван Лявонавіч часта бывае ў Мінску, а я, калі прыязджаю ў свае Сабалі, не мінаю яго. І от зараз, калі я прыехаў, каб «нанюхацца» жыцця, я сустрэў Івана ля калгаснай канцылярыі. Угледзеў нешта нават незнаёмае ў ім — нейкія ўладныя ноткі і ўбачыў, што яны напускныя ў ім. Яму ўласціва натуральнасць інтанацыі, нават тады, калі ён злуецца. Яго злосць таксама натуральная, як узрушэнне. Але заўсёды ў яго словах і справах адчуваецца клопат пра людскую долю, і гэтая доля мае быць заўжды куды найлепшай, чым сёння. Вось чаму я кожны раз, калі бываю ў сваіх Сабалях, ці калі Іван Лявонавіч бывае ў Мінску і заходзіць да мяне, рады зверыць свае пачуцці з ягонымі. Мне здаецца, што ў гэтым заключаецца і сувязь з жыццём, праўду якога трэба звяраць па праўдзе жыцця асобных людзей. І добра, калі ў нас, пісьменнікаў, ёсць па кім звяраць гэтую праўду, калі нас з людзьмі яднае не толькі прафесіянальнае жаданне ведаць жыццё, але і сяброўскія пачуцці, якія, мабыць, даражэйшыя і важнейшыя за многае...

Жыццё ў народзе, разуменне яго клопатаў, сувязі з гэтымі клопатамі — гэта дужа важна, неабходна для таго, каб разумець само жыццё. Вось праз свайго сябра, земляка Івана Лявонавіча, і не толькі праз яго, я і шукаю самай найглыбейшай крыніцы рэчаіснасці, каб чытач ніколі мне не асмеліўся сказаць, што я ступаю толькі па раніцнім расе, баючыся нырэць у глыбіню самой крыніцы. І я ныраю, я шукаю самога глыбу, і памагае мне ў гэтым мой земляк, мой сябра, старшыня роднага майго калгаса «Шлях да камунізма» Іван Лявонавіч Сабаленка. Я шчыра ўдзячны яму.

г. Брагін.

Чалавек нараджаецца для шчасця... У чым жа яно, шчасце нашага сучасніка?

Леанід Івашкевіч, электраналадчык завода аўтаматычных ліній, мог адказаць на такое пытанне проста. Яго асабістае шчасце ў тым, каб кожную раніцу прыходзіць сюды, у родны цэх, каб мець права вымаўляць словы — «наша брыгада», «нашы станкі», «наша праца»... І яшчэ ў тым, каб людзі прысвоілі табе высокае званне «Майстра залатыя рукі» і каб насіў ты гэтае званне побач з другім імем, вышэй за якое няма нічога на зямлі. Імем — камуніст.

І яшчэ... каб сусед твой, які жыве з табою побач, няхай сабе пакуль што і ў агульнай, камунальнай кватэры, і надалей мог сказаць пра тваю сям'ю:

— Такой прыгожай і дружнай пары, як Леанід Івашкевіч і яго жонка Ліда, я ніколі яшчэ дагэтуль не сустракаў у жыцці.

Фота Ул. КРУКА.

САМЫ ВЯЛІКІ СКАРБ

Па той бок мяжы, у капіталістычным свеце, вельмі многа пішуць пра нас. «Спецыялістаў па рускаму пытанню» развялося як ніколі. І кожны з іх абавязкова ж разбіраецца ў нашых справах, разумее нашу душу лепш, чым мы самі. Маланкі ісцін так і ўспыхваюць над зямлёю, паказваючы, куды мы ідзём і куды заварочваем.

Вось адна з гэтых шматлікіх кніг — «Савецкі чалавек», выпушчаная ў Штутгарце, у Заходняй Германіі. Аўтар яе Клаус Менерт мае перад некаторымі іншымі знаўцамі «рускай душы» рэальныя перавагі: ён аж дванаццаць разоў быў у Савецкай краіне на працягу трыццаці гадоў. Значыцца, на ўласныя вочы бачыў, што адбываецца на яе прасторах, уласнымі вушамі слухаў, чым заклапочаны, чым жывуць нашы людзі. Чэрпаў, як кажуць, факты з жывых крыніц.

За такі час можна, вядома, многае зразумець. Аднак пры невялічкай умове — калі шчыра ісці насустрач фактам і аддавацца іх уладзе, а не ўладзе прадузятых схем і догмаў. Ды вось па гэтай галіне наш шаноўны назіральнік аказаўся, мякка кажучы, слабаватым. І асабліва, калі справа дайшла да светапогляду і псіхалогіі савецкага чалавека, яго інтарэсаў, схільнасцей і густаў.

У эканоміцы нашай краіны адбыліся грандыёзныя змены, — гэта аўтар прызнае [дзіва што!]. Шматлікімі лічбамі даводзіць ён размах культурнай рэвалюцыі,—таксама, значыць, прызнае. А вось псіхалогія людзей... А што псіхалогія! Хіба яе можна перайначыць, калі ў буржуазнай філасофіі на гэты конт зусім ясная думка: чалавек заўсёды застаецца чалавекам, якія б парадкі ў свеце ні існавалі. Тым чалавекам, што жыве толькі асабістымі клопатамі і носіць у сабе спрадвечную непрымірымасць з грамадствам. Якому, калі і ёсць справа да іншых, то толькі з меркаванняў уласнай выгоды. Словам, шырока вядомая аналогія з драпежнікамі.

З пазіцый такой вось замшэлай філасофіі бярэцца аўтар кнігі меркаваць і аб метадзе савецкай літаратуры. У прынцыпах і патрабаваннях сацыялістычнага рэалізму — «паказваць рэчаіснасць у яе руху наперад», «паказваць чалавека не статычна, а ў развіцці», гаворыць ён, пры ўважлівым разглядзе «не знойдзеш ні грана рэалізму». Гэта, маўляў, і не адпавядае эстэтычным густам савецкіх людзей; не выпадкова ж «мільёнам рускіх» імпануе характар лермантаўскага Пячорына — ён і застаецца самым папулярным «героем нашага часу».

Нічога не скажаш — сапраўды «ні грана рэалізму» не бачыш, калі чытаеш такія «экскурсы» ў наша жыццё.

Не, цяжкаватую задачу бяруць на сябе «спецыялісты па рускаму пытанню» тыпу памянёнага намі. Калі нават некаторыя з іх і хочуць шчыра разабрацца, у чым тут справа, чаму наша краіна здзіўляе свет перамогамі, вартымі легенд, то ім гэта не пад сілу, бо трэба перш за ўсё адмовіцца ад забабонаў буржуазнай прапаганды. Адмовіцца і зразумець новую прыроду нашага ладу, заснаванага на сапраўды гуманістычных прынцыпах, азоранага вялікай ідэяй — усё ў імя чалавека, для дабра чалавека.

Так, іменна з пафасам рэвалюцыйнага пераўтварэння свету, у тым ліку і псіхалогіі шырокіх народных мас, звязана жыццёвая і мастацкая праўда аб нашым грамадстве. І калі савецкая літаратура паказвае свой народ у вялікім паходзе, калі яна бачыць чалавека не статычна, а ў развіцці, у руху да вышэйшай дасканаласці, то тут дзейнічае не «дыдактычны утапізм», а закон рэалістычнага мастацтва. Аднаго толькі можна пажадаць—каб яна яшчэ больш мудра і назіральна пранікала ў новыя з'явы жыцця, яшчэ больш натхнёна расказвала пра нашага сучасніка.

Цяжка паддаюцца простаму ўяўленню ўсе тыя багацці, што стварыў сваімі працавітымі рукамі наш народ пад кіраўніцтвам роднай партыі. Але асабліва наш здабытак — багацці духоўныя, маральныя. «З УСІХ КАШТОЎНАСЦЕЙ, СТВОРАНЫХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ ЛАДАМ, САМАЙ ВЯЛІКАЙ КАШТОЎНАСЦЮ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НОВЫ ЧАЛАВЕК—АКТЫЎНЫ БУДАЎНІК КАМУНІЗМА,— сказаў М. С. Хрушчоў. — Савецкі народ дае ўсё новыя доказы таго, на што здольны па-сапраўднаму свабодны чалавек новага свету».

Сацыялістычны лад узвялічвае чалавека і стварае ўсе магчымасці для яго ўсебаковага, гуманістычнага развіцця. Можна было б прывесці тысячы прыкладаў, фактаў, параўнанняў, каб паказаць, як з кожным годам усё больш поўна і рознабакова раскрываюцца творчыя здольнасці савецкіх людзей. Дух творчасці, прага пошукаў—гэта сапраўды характэрныя прыкметы нашага часу. І з тым большай сілай заструменілі крыніцы народнай ініцыятывы, калі партыя паявіла рашучую барацьбу з культам асобы, адкінуўшы прэч філасофію «вінцікаў», аднавіўшы ленінскія прынцыпы ва ўсіх галінах эканамічнага і грамадскага жыцця.

Пачуццё гаспадара краіны нараджае ў савецкіх людзей высокую адказнасць перад грамадствам, перад калектывам, сваімі таварышамі па працы, адказнасць за лёс нашых вялікіх і малых спраў. У гэтай атмасферы і складваюцца новыя маральна-этычныя нормы, новыя дачыненні чалавека і грамадства, аб якіх у мінулым можна было толькі марыць. Выдатнай асаблівасцю маральнага кодэкса будаўніка камунізма, абвешчанага ў новай Праграме партыі, з'яўляецца тое, што ён узнік не як плён абстрактных разважанняў, а ўвабраў у сябе рэальныя дасягненні нашага грамадства. Адданасць справе камунізма; любоў да сацыялістычнай Радзімы; брацкая салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін, з усімі народамі; добрасумленная праца на карысць грамадства; калектывізм і таварыская узаемадапамога; гуманныя ўзаемаадносіны і ўзаемная павага паміж людзьмі, калі чалавек чалавеку — друг, таварыш і брат; непрымірымасць да несправядлівасці, дармаедства, кар'ерызму, хціваści — гэтыя і іншыя прынцыпы маральнага кодэкса, запісанага ў Праграме партыі, адлюстроўваюць жывыя рысы нашага сучасніка—перадавога савецкага чалавека.

Тым больш яскрава бачым мы наш заўтрашні дзень, калі жыццё кожнага чалавека будзе ўзбагачаць сабой багаты свет духоўнай прыгажосці. Тым большая наша вера ў канчатковую перамогу гуманістычных ідэй партыі.

Задача заключаецца ў тым, каб новыя маральныя прынцыпы сталі ўнутранай патрэбай усіх савецкіх людзей. У гэтым напрамку партыя прыкладае велізарныя намаганні. Неўзабаве ў Маскве склікаецца Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС, прысвечаны ідэалагічным пытанням. Ён, безумоўна, стане важнай падзеяй духоўнага жыцця краіны і паслужыць новаму ўздыму выхаваўчай работы.

Для Камуністычнай партыі няма нічога даражэй за шчасце людзей, духоўнае хараство і прыгажосць чалавека. У імя гэтага — усе нашы планы і здзяйсненні.

Гераічнае побач

ШЛЯХ ПЯТРА ГАЙДУКА

Токар цэха шасі Мінскага аўтамабільнага завода Пётр Гайдук нядаўна вярнуўся з Масквы, дзе прымаў удзел у рабоце нарады перадавікоў руху за камуністычную працу. У ліку іншых наватараў вытворчасці Пётр быў узнагароджаны медалем «За працоўную доблесць».

Можна шмат расказваць аб працоўным гераізме перадавога рабочага. Можна, аднак, абмежавацца адным фактам. Пётр прыйшоў на завод, маючы чатырохкласную адукацыю, а цяпер ён — студэнт вячэрняга аддзялення політэхнічнага інстытута. Усе чатырнаццаць гадоў, што Пётр на заводзе, ён вучыцца. Вучыўся спачатку дома, каб паступіць у шосты клас вячэрняй школы (з чатырохкласнай адукацыяй не прымалі), скончыў паспяхова дзесяцігодку, а цяпер штурмуе вяршыні вышэйшай адукацыі. За гэтыя ж гады Пётр Гайдук атрымаў высокія разрады па трох рабочых спецыяльнасцях: токара, фрэзероўшчыка і шліфавальшчыка.

У КАМАНДЗІРОЎЦЫ

Пажар у гарадку, дзе амаль усе будынкі драўляныя, — бяда страшная. У гэты дзень яна пагражала Лунінцу.

Але няшчасця не здарылася...

Мінчанін Яўген Цароў, які прыехаў у Лунінец у камандзіроўку, заўважыў, як у адным хляве загарэлася сена. «Тав. Цароў, — значыцца далей у рапарце пажарнай каманды, — смела ўскочыў у хлеў і падручнымі сродкамі пачаў тушыць агонь. Зрабіць гэта было нялёгка, але тав. Цароў са сваёй задачай справіўся»...

Тушэнне пажараў, зразумела, не ўваходзіць у функцыі камандзіровачных. Але калі людзям пагражае бяда...

ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ!

Каля 20 дзён гасцілі ў нас пісьменнікі Далёкага Усходу А. Дракахруст, Ул. Кліпель, А. Рыбачкін, Ул. Санга, С. Смалякоў. Госці наведалі Брэст, Гродна, Віцебск, Магілёў, Полацк, сустракаліся з рабочымі калектывамі Нафтабуда, віцебскага завода імя Кірава, мотавелазавода, выступалі па радыё і тэлебачанню.

11 чэрвеня госці выехалі дамоў. Цёпла і сардэчна праводзілі іх беларускія сябры.

Паміж Беларуссю і Далёкім Усходам тысячы кіламетраў. Але вялікія адлегласці не перашкаджаюць дружбе нашых літаратур. Беларускія чытачы на роднай мове знаёмяцца з вершамі і апавяданнямі далёкаўсходніх літаратараў, на Далёкім Усходзе перакладаюць творы нашых паэтаў і празаікаў.

Шчаслівай дарогі вам, далёкаўсходнія браты!

ПАДАРУНАК МАСТАКА

Мікалай Пятровіч Страх, выкладчык гісторыі Дукорскай сярэдняй школы, увайшоў у канцылярыю з газетай у руках і сказаў:

— У Мар'інай Горцы выстаўка твораў Генрыха Францавіча Бржазоўскага, трэба абавязкова запрасіць яго да нас!..

Нездарма зацікавіліся ў Дукоры творчасцю мастака. У час вайны ён ваяваў тут у партызанскім атрадзе. Дукорцы захацелі ўбачыць карціны свайго таварыша па баях, выказаць аб іх сваю думку.

І вось Мікалай Пятровіч едзе ў Мінск.

Генрых Францавіч з прыемнасцю прыняў запрашэнне сяброў, а Саюз мастакоў БССР дазволіў яму змяніць маршрут выстаўкі.

Хутка ў пасёлку цяжка было знайсці чалавека, які б не бачыў работ свайго земляка. У адзін з дзён адбылося абмеркаванне выстаўкі.

Мастак падараваў дукорцам каля 50 сваіх карцін, эцюдаў, малюнкаў. Сярод іх шмат пейзажаў, зробленых у ваколіцах Дукоры, партрэты партызан, з якімі Г. Бржазоўскі разам ваяваў.

А. ПІКУЛІК.

Антон БЯЛЕВІЧ

ЛЮБЛЮ ЖЫЦЦЁ

Зімой.
Вясной.
А, можа, ўвосень,
У тыя самыя часы,
Калі пажнём, атаву скосім,
Калі даспеюць верасы, —

Падыдзе смерць:
— Ну, як!.. Гатовы!
Цябе ў апошні шлях прашу...
І вырве з рук маіх аловак,
І верш апошні, верш мой новы,
Магчыма, я не дапішу.

Радок, магчыма, абарвецца,
Як сэрца, спыніцца радок.
Ды я скажу рашуча смерці:
— Старая, нельга мне памерці,
Пакуль майго жыцця клубок
Імкліва коціцца праз вёскі,
Пасёлкі, сёлы, гарады,
Праз хвалі траў, азёрны плёскат,
Праз песні, шолахі, сады,
Якія ў сэрцы праз гады.

Жыву,—пакуль з душы не выйшлі
Чаромхі цвет і квецень вішні,
І водар ліпы, чабарку,
І гэта ціхае «ку-ку».
І гэты буркат галубіны,
І чырвань гэтае шыпшыны,
І смолкі водар на сасне
У маёй Дуброўскай старане,
І нашых спраў узлёт арліны—
Не пусцяць з роднае краіны
Заўчасна ў жвір сыры мяне.

Жыву ў лужку, што пры дарозе,
У грушы-дзічцы на мяжы,
У клёне, ясені, бярозе,
У дубе гэтым буду жыць,
Які магутна каранямі
Аплёў зямлю,
Сцвярдзеў, бы камень,
Пад слотай, спёкай, маразамі
Шарэў, шурпацеў праз гады.
А прыйдзе смерць і перунамі
Яго падкосіць,—я тады
Жыццём сваім праз жалуды
Праб'юся зноў у той лагчыне,
Зноў учаплюся за зямлю.
Пад небам роднае Айчыны
Любіў, люблю, не разлюблю
Жыццё і ўсе яго вытокі
Кахання, радасці, падзей.
Люблю жыццё, яго высокі,
Святы закон і ўзлёт людзей.
Любоў не скосяць шаблі, кулі,
Любоў—з жыццём, з яго красой.
А смерць—злавесная бабуля—
Сама зарэжацца касой!

Надзённае, неадкладнае

ПРАВАФЛАНГОВЫЯ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Паўтары гады мінула з таго часу, як у нашай рэспубліцы быў праведзены агляд агітацыйна-мастацкіх брыгад. Гэта было сапраўднае свята народных талентаў, людзей сціплых, працавітых, ініцыятыўных, якія свой вольны час аддаюць любімай справе — самадзейнаму мастацтву і ў любое надвор'е ахвотна выязджаюць з канцэртамі ў самыя далёкія вёскі сваіх раёнаў. Агляд паказаў творчы рост агітацыйна-мастацкіх брыгад, іх баявітасць, цесную сувязь з жыццём.

А як жа сёння працуюць агітбрыгады, чым радуюць яны працаўнікоў горада і вёскі, якія новыя творчыя здабыткі набылі за гэты час?

Вось агітбрыгада Сінкевіцкага сельскага Дома культуры, якой кіруе Мікалай Лук'яновіч. Каля трыццаці канцэртаў наладзіла сёлета агітбрыгада для хлебаробаў Лунінецкага раёна. Адзін з апошніх канцэртаў адбыўся ў вёсцы Радзікірава. Перад пачаткам свайго выступлення ўдзельнікі агітбрыгады ўпрыгожылі клуб нагляднай агітацыяй. Былі вывешаны партрэты перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці, кім заслужана ганарацца калгаснікі; не забыліся і пра тых, «з кім нам не па дарозе»: гультаёў, п'яніц, абібокаў. Вострыя карыкатуры трапна высмейвалі іх. А потым пачаўся канцэрт: песні, частушкі, інтэрмедыі. Найбольшым поспехам карысталіся баяніст Губіч і бібліятэкар Кацуба. Яны самі складаюць частушкі на мясцовыя тэмы. Добра спланаванае, прадуманае выступленне агітбрыгады спадабалася калгаснікам.

Прапагандаваць рашэнні партыі і ўрада, арганізоўваць культурны адпачынак працоўных, памагаць мясцовым партыйным арганізацыям у камуністычным выхаванні мас — такія высакародныя задачы стаяць перад агітацыйна-мастацкімі брыгадамі.

Іх многа ў нас, гэтых нястомных прапагандыстаў новага, перадавога, правафланговых мастацкай самадзейнасці, стваральнікаў добрага, бадзёрага настрою. У рэспубліцы працуе тры тысячы агітбрыгад! Яны сталі найбольш папулярным у народзе відам мастацкай самадзейнасці, дзе спалучаецца мастацтва з разнастайнымі формамі масава-палітычнай работы. Многія агітбрыгады заваявалі шырокую папулярнасць у працаўнікоў горада і вёскі. Лепшымі сярод іх заслужана лічацца Лёзненская агітацыйна-мастацкая брыгада Віцебскай вобласці, Стаўбцоўская агітбрыгада Мінскай вобласці, Рэчыцкая і Брагінская — Гомельскай вобласці. Гэтыя агітбрыгады даўно перайшлі ад звычайных канцэртаў да літаратурна-музычных тэатралізаваных кампазіцый, дзе за аснову канцэртнай праграмы бяруцца факты і прыклады, узятыя з мясцовага жыцця. Таму кожны канцэрт — гэта вострая, мэтанакіраваная гаворка пра надзённыя справы калгаса, саўгаса, прадпрыемства. Ужо адны назвы тых канцэртных аглядаў, з якімі выступалі агітбрыгады, гавораць аб іх змесце і характары: «Народны кантроль» (Лёзненскі РДК), «З «Вожыкам» у калгасе» (Стаўбцоўскі РДК), «Рэйд газеты на борце «Ракеты» (Рэчыцкі ГДК), «Дружба» (Ашмянскі РДК).

Каб выступленне агітбрыгады было дзейсным і цікавым, каб яно кранала і хвалявала сэрцы савецкіх людзей, трэба ўдумліва падбіраць рэпертуар, старанна рыхтавацца. Творчасць агітбрыгад сінтэтычная: тут і баявая патрыятычная песня, і танец, і спектакль па аднаактовай п'есе, і вясёлая частушка, інтэрмедыя, і нарэшце, музычна-тэатралізаваная кампазіцыя.

Добра робяць тыя агітбрыгады, удзельнікі якіх не чакаюць, пакуль ім дамы народнай творчасці прышлюць гатовы сцэнарый выступленняў, а самі спрабуюць свае сілы, самі складаюць і песні, і частушкі, і літаратурна-музычныя агляды. Вось чаму ў канцэртах стаўбцоўскіх, салігорскіх, лёзненскіх энтузіястаў самадзейнага мастацтва заўсёды адчуваеш подых жыцця народа, іх выступленні арыгінальныя па задуме і самабытныя па форме.

Трэба імкнуцца да таго, каб кожны раённы і гарадскі Дом культуры, кожны сельскі і прафсаюзны клуб мелі сваю агітбрыгаду і сістэматычна выступалі з канцэртамі ў калгасах і саўгасах, на прадпрыемствах і будоўлях. Абавязак аддзелаў і ўпраўленняў культуры, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый — больш канкрэтна займацца агітбрыгадамі, памагаць ім. Часам у сельскім клубе цяжка стварыць вялікі самадзейны калектыў, у якім бы прымала ўдзел 30—40 чалавек, але мець агітбрыгаду можна, бо для гэтага патрэбна 10—12 улюбёных у сваю справу энтузіястаў. А іх не так ужо цяжка адшукаць.

Лета — гарачая пара палявых работ у вёсцы. І як удзячны калгаснікі, калі да іх у поле прыязджае з невялікім дакладам і канцэртам агітбрыгада. Тым не менш ужо выклікаюць трывогу факты, калі некаторыя агітбрыгады гарадскіх дамоў культуры паспалілі сваю работу, рэдка выязджаюць з канцэртамі на вёску, бо, бачыце, сяло — гэта ўжо не іх ведамства, яны ж цяпер «гарадскія». Так здарылася, напрыклад, з агітбрыгадамі Кобрынскага і Лунінецкага дамоў культуры. Гэта няправільна. Наадварот, сваю ўвагу агітбрыгады абавязаны сёння скіраваць на тое, каб як мага лепш абслужыць працаўнікоў калгаснай вёскі.

У Віцебскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях сёлета будуць праведзены агляды творчых дасягненняў агітбрыгад. Гэта таксама адзін са стымулаў для далейшага творчага росту самадзейнасці. Але непакоіць тое, што на Гродзеншчыне і ў Магілёўскай вобласці ўвага да агітацыйна-мастацкіх брыгад чамусьці аслабла. І як вынік — творчае жыццё ў многіх калектывах паступова затухае. За апошні час не чуваць, каб у гэтых абласцях нарадзіліся новыя агітбрыгады.

І сёння праблемай нумар адзін для агітбрыгад з'яўляецца баявы, надзённы, высокаідэйны рэпертуар. Абласныя дамы народнай творчасці робяць тут вельмі ўжо нясмелыя крокі. Рэспубліканскі ж Дом народнай творчасці разаслаў сёлета агітбрыгадам усяго толькі адзін сцэнарый, прысвечаны веснавым палявым работам. Праўда, рыхтуюцца да друку яшчэ два сцэнарыі. Але ўсё гэта — кропля ў моры. Рэпертуарная праблема па-ранейшаму застаецца вострай.

Якое ж выйсце трэба шукаць з гэтага становішча? Перш за ўсё захвочваць і падтрымліваць тыя калектывы, дзе самі клапоцяцца пра свой рэпертуар. У такія агітбрыгады неабходна пасылаць рэжысёраў народных тэатраў, мясцовых паэтаў, самадзейных кампазітараў. Іх творчая дапамога будзе надзвычай карыснай.

Ёсць у Акадэміі навук БССР Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Яго супрацоўнікі штогод арганізуюць экспедыцыі па збіранню фальклору: запісваюць прыказкі, частушкі, песні. Сёе-тое з гэтых матэрыялаў можна адабраць, належным чынам апрацаваць і рэкамендаваць агітбрыгадам. Чаму ж гэты каштоўны матэрыял павінен гадамі ляжаць у фондах інстытута і чакаць, пакуль выйдуць у свет спецыяльныя выданні? Можна ж ім даць ход больш аператыўна і з большай карысцю для народа. Трэба прасіць і нашых пісьменнікаў, журналістаў, кампазітараў—больш дзейсна адгукацца на патрэбы агітбрыгад. Некаторымі рэпертуарнымі матэрыяламі маглі б падзяліцца з самадзейнымі артыстамі эстрадныя брыгады Дзяржаўнай філармоніі ды зрэшты і даць ім творчую параду ў час гастролей па рэспубліцы.

Трэба зрабіць усё магчымае, каб кожная агітацыйна-мастацкая брыгада была сапраўдным баявым прапагандыстам ідэй нашай партыі ў гушчы працоўных мас, каб яна несла народу савецкае мастацтва.

ДАРОГА БЕЗ ПРЫВАЛУ

Анатоль ВЯЛЮГІН

Нядоўга дыхала, ледзь ліпела, як верхаводка на пяску, адна тэорыйка. Цяжка было разгледзець яе праз мікраскоп, але ўсё ж яна існавала, маскіруючыся то пад дамарослы неарэалізм, то пад безліч новых імпартных «ізмаў», існавала, скіроўваючы літаратуру і мастацтва на задворкі жыцця, дзе гаспадарыць плесня і пах не зусім прыемны. Пад вострым пражэктарным святлом партыйнай крытыкі ўсе пабачылі і зразумелі спарахнелую сутнасць яе, гэтак званай тэорыі дэгераізацыі, дэгераізацыі нашага жыцця, нашага сацыялістычнага грамадства.

Добры, прасякнуты рамантыкай, сонечны вецер высокага будня шаруе мазгі, распагоджвае сумотны зрок у самотных гора-тэарэтыкаў. На абшарах зямлі, у чалавечых душах і думках не спыняецца, не сціхае «Ваш апошні рашаючы...» Спакой толькі сніцца — пэўна, і ў гэтым сіла, трываласць нашай справы.

Нядаўна я з Рыгорам Няхаем працаваў над сцэнарыем поўнаметражнага дакументальнага фільма аб сучасніках, нястомных і ў баі і ў працы, звычайных людзях, рукамі і думкамі якіх сагрэта, узвялічана Радзіма. Нам дапамагаў Іосіф Вейняровіч, рэжысёр будучага фільма. Вопытны дакументаліст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, ён некалькі разоў з кінаапаратам выкідваўся на парашуце ў бранскія, віцебскія, палескія лясы, змераў за вайну бясконцыя петлі партызанскіх сцежак і франтавых дарог. Мы прагледзелі кіламетры плёнкі, знятай ім, і перад намі паўстала мноства цікавых, непаўторных сюжэтаў, што ашчадна захоўваюцца ў Дзяржаўным фільмафондзе.

Праўда, людзі з партызанскага кіналетапісу часта не маюць прозвішчаў, імёны іх былі засакрэчаны ў час вайны, нават сам кінаапаратар названы таварышам В. Пачаліся цяжкія пошукі.

* * *

Грыф Дзяржфільмафонду: «№ 3631 (Н-173) к 27.III.У-А-2. Вясна 1942 г.». А на істужцы — лес, ідуць партызаны... Наперадзе шасейка. Партызаны залягі ў кустах. Нямецкі салдат валачэцца па шашы. Патруль... Трапны стрэл з «бясшумкі» — падае салдат. Партызаны выбягаюць на дарогу. Падпілоўваюць тэлеграфныя слупы. Валяцца, ірвучы дрот, слупы... Пад бэлькі бетаніраванага мастка кладуць тол... Партызан чапляе да міны канец провада, закопвае міну: будзе нямецкі сувязіст шукаць канец провада і...

Партызан разбівае тапаром ізалятары на паваленых слупах.

Пусцее дарога.. Дарогай ідуць сувязісты ў мышастых шынялях. Меркавалі, што з'явіцца адзін, а тут ажно тры... Узрываецца міна... Трупы варожых салдат. Яшчэ выбух — ляціць у паветра мост...

Прамільгнула кінаістужка, а ў вачах усё яшчэ стаіць жылісты дзяцюк з тапаром, ляцяць аскепкі белых ізалятараў... Хто ён?

Мінскі аўтамабільны — горад у горадзе. Ёсць там праспект Чырвоных Партызан. У ціхіх катэджах жывуць кадравыя рабочыя, інжынеры. Хтосьці, будуючы дом, пакінуў у палісадзе на памяць сасну — жыхарку лесу, што калісьці шумеў тут.

На праспекце Чырвоных Партызан мы выпадкова пазнаёміліся з інжынерам Труфанавым. Пятро Сцяпанавіч — інжынер заводскай службы сувязі. Гэта складаная, тэхнічна багатая гаспадарка, якой можа пазайздросціць іншы горад.

З разнасцежаных варот завода выходзіла калона новых машын. Сабраліся рабочыя, інжынеры.

— Так часта гэта бывае, а я заўсёды хвалююся,— задумаўся Труфанаў. — Далёкая дарога ў нашых МАЗаў.

Далёкая... Ляцяць з МАЗаў абломкі скальных парод, бетонныя кубы і піраміды ў пеністую прорву прарана, кіпіць, злуецца барадаты Енісей у раёне Краснаярска... Стаяць жалезныя волаты на міжнародных выстаўках — у Бруселі, у Капенгагене... Натужна гудуць маторы МАЗаў на белай камяністай дарозе пад пальмамі Кубы...

— Вы даўно на заводзе, Пятро Сцяпанавіч?

— З самага пачатку. Проста з лесу — на завод.

— Партызанілі?

— Быў у спецкрупе на Віцебшчыне. Завочна закончыў політэхнічны інстытут... Сядзіш цяпер за пультам, успомніш «партызанку» і ўсміхнешся: калісьці ж я ламаў сувязь па лясных дарогах...

Мы запрасілі Труфанава на кінастудыю. Калі на экране замільгалі кадры ваеннай хронікі, Пятро Сцяпанавіч прыгнуў галаву, як перад скачком, пальцы ўпіліся ў спінку пярэдняга крэсла: пад бэлькі бетаніраванага мастка кладуць тол... партызан чапляе да міны канец провада... партызан з тапаром...

— Гэта ж я! — падскочыў Труфанаў. І да Вейняровіча: — Помню, помню, Іосіф Навумавіч, як вы тады здымалі мяне...

Мы жартавалі: вось дык інжынер сувязі — тапаром па ізалятарах!..

* * *

Шыракашумны і зялёны, шыракаплечы і святлісты, адзін з прыгажэйшых гарадоў свету — Мінск. Ён будаваўся, рос на вачах у нас. Ляцяць гады, і людзі забываюць новую Пампею, страшную памятку вайны, толькі што вызваленую беларускую сталіцу. А кіналетапіс захаваў яе... Пахла папялішчамі і палыном. Войскі рушылі на захад, а з лясоў ішлі партызаны ў Мінск. 198 партызанскіх брыгад — 1058 атрадаў, слава народа — партызанская армія ў 300 тысяч штыкоў!

Партызанскі парад на іпадроме. Вакол руіны... Застылі калоны. Правафлангові— дужы мужчына. Гэта, відаць, камандзір. На грудзях вісіць аўтамат, як бінокль... Калоны рушылі па Мінску. У стракатай лавіне парада — хваляванне, радасць перамогі, вайсковы лад і часам такое смехацце, што і не прыдумаеш. От напярэдадні калоны паважна перабіраю ножкамі пястун партызанскай кухні, абвешаны трафейнымі генеральскімі крыжамі, белабароды казёл. Яго вядзе дзед-партызан Гальчэня...

На ўскраіне горада сядзіць у акопчыку чубаты юнак з кулямётам. Партызаны пільна вартуюць родную сталіцу — на паўднёвы ўсход ад Мінска захраслі ў лясах над Волмай фашысцкія дывізіі. Б'юць «кацюшы», батарэі. Танкі падмінаюць арэшнік. Дакіпае чарговы нямецкі кацёл. Густы, аглухлы ад гулу лес. Знямогся гітлераўскі генерал: мундзір і шапка вісяць на сукаватай сасне, а сам ваяка ляжыць у палатцы, абыякавы да ўсяго, гатовы здацца ў палон або памерці. Адваяваўся...

Савецкія аўтаматчыкі прачосваюць жыта. Чатыры фашысцкія генералы ўзнялі ўгору рукі... Так выглядала тым летам праполка...

На ўзмежак і ў кювет ляціць пустазелле — дзяўчаты полюць лён у калгасе «Парыжская камуна». Тут, на полі ў Глыбоцкім раёне, паэты сустрэліся са старшынёй у засені кукурузы. Ладная кукуруза — старшыню перарасла, і паэты здзівіліся: прыехалі чытаць вершы, а знайшлі свайго героя! Вось ён, правафлангові на партызанскім парадзе ў Мінску — Павел Якаўлевіч Сарамаха, старшыня вядомага ў рэспубліцы калгаса «Парыжская камуна».

* * *

Удзень і ўначы лёталі да партызан пілоты з палка Клусона. Палкоўнік Клусон, пенсіянер, жыве ў Мінску. У аэрапорце працуюць Іван Лук'янавіч Тарасаў, Апанас Жога — лётчыкі са славутага палка.

Глыбокае крынічнае неба. Да будынка падрульвае серабрысты лайнер. Тарасаў праводзіць на курорт кагосьці са сваіх знаёмых. Ён бярэ на рукі дзяўчынку, сябры ідуць па лётнаму полю...

Адразу прыгадваюцца кадры кіналетапісу. Тарасаў прызямляўся на партызанскім аэрадроме... Выгружаюць патронныя скрынкі, нясуць на фурманкі... Лётчыкі ўсаджваюць дзяцей на самалёт. Кудлатыя, абшарпаныя дзеці вайны. Іх вывозяць на Вялікую зямлю з блакіраванай ворагам зоны. Друга Івана Лук'янавіча Тарасава, лётчыка Мамкіна, падбілі над лініяй фронту. І ўсё ж здолеў ён пасадзіць машыну. Сам загінуў, а дзеці былі выратаваны.

Гэта здарылася на Віцебшчыне.

Віцебскія лясы часта ўспамінае Герой Савецкага Саюза Міхаіл Ягораў. Увесь свет ведае гэта прозвішча: сяржант-разведчык Ягораў і радавы Кантарыя 1 мая 1945 года ўзнялі сцяг Перамогі над рэйхстагам у Берліне. Толькі мала хто ведае аб тым, што Міхаіл Ягораў — беларускі партызан, некалькі год ён партызаніў на Віцебшчыне, падарваў пяць фашысцкіх эшалонаў, атрымаў два баявыя ордэны, а пасля дайшоў да рэйхстага. Жыве Ягораў у Рудні, працуе ў райпрамгасе, часта наведвае аршанскія і лепельскія калгасы.

Тут курыліся папялішчы. На сэрцы шчыміць ад болю, калі глядзіш, стаіўшы дыханне, на пакінутыя вякам малюнкі бяды і гора народнага: каля зямлянкі сядзяць у лахманах мурзатыя дзеці... Хлопчык ставіць на абгарэлым дрэве шпакоўню. Вільготна і цёмна ў зямлянцы. Пры вузенькім акенцы дзяўчынка чытае буквар. Школа ў зямлянцы. Дзеці пішуць на бяросце: «Мы адбудуем родны край». Калючы дрот на зямлі, парэзанай акопамі. Партызаны ў былым лясным лагеры ставяць зрубы. Гэта Асвейшчына. На зрубе чэша бервяно Герой Савецкага Саюза. Малады. Прыгожы.

Яго сустрэлі на эстакадзе Полацкага Нафтаграда. Пад эстакаду падаваўся эшалон з волжскай нафтай. В. І. Яронька — намеснік начальніка будаўніцтва па тэхнічным забеспячэнні. Калісьці вызваляў Гомель артылерыст Яронька. Ён першым фарсіраваў Сож. Немцы трымаліся моцна. Наша пяхота адступіла. Астаўся на плацдарме тры гарматы без разлікаў — толькі Яронька ды баец, які пасля паплыў прасіць падмогі. Яронька адзін стаяў супроць фашысцкіх танкаў. Стаяў з сямі гадзін раніцы да дванаццаці ночы. Знішчыў сем танкаў.

* * *

У Гомельскім паравозным дэпо працуе Пятро Васільевіч Васяновіч. Капітан запасу, ён у сорак першым быў старшым машыністам легендарнага браняпоезда № 56, які тады назвалі крэпасцю на колах. Браняпоезд загінуў у няроўным баі, а сэрца чалавека больш трывалае. Яно і сягоння не просіць спакою. Над сэрцам побач з баявымі ўзнагародамі — ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Звязды — медаль «За працоўную доблесць». Мы ішлі з Пятром Васільевічам па плошчы Працы. Там стаіць помнік воінам і партызанам. На граніце сярод кветак — прозвішча Героя Савецкага Саюза Ісачанкі, гомельскага падпольшчыка і партызана. Па Сожы ходзіць цеплаход, і на ім напісана: «Ісачанка». Мы жывём, каб, паміраючы, увасобіцца «в пароходы, строчки и другие долгие дела».

У Бешанковічах ёсць вуліца імя Чуклая. Вуліца Чуклая ёсць у Пінску. І ў Салігорску — Чуклаеўская вуліца. Кім ён быў, гэты чалавек, іменем якога названа вуліца, што ідзе праз усю Беларусь?

У вёсцы Пруданы, што побліз Бешанковіч, саўгасная камсамольская брыгада носіць яго імя. На Пінскім фанера-запалкавым камбінаце брыгада імя Чуклая здабыла ў працы права звацца камуністычнай.

То не гром грыміць над краем —
То ад Піны да Арэсы
Ходзіць слава пра Чуклая,
Баявая наша песня.

Гэта народная песня. Яе спявае брыгада салігорскіх будаўнікоў, якая таксама заваявала званне камуністычнай і носіць імя Чуклая. Брыгаду ўзначальвае Леанід Якубаў. Яны будаўнікі, але хто ў порце не лічыць сябе мараком? Яны таксама шахцёры. Будаўнікі спусціліся з рыштаванняў, шахцёры падняліся з-пад зямлі. Бывае так, што на Чуклаеўскай вуліцы іх сустракаюць бабулька з генералам. Бабулька — маці Івана Чуклая Ульяна Іванаўна. Яна прыязджае з Мазыра прывеціць сваіх нарачоных сыноў. Чалавек у генеральскай форме з Зоркай Героя — партызанскі генерал, старшыня палескага калгаса Васіль Захаравіч Корж.

Усе збіраюцца ў чырвоным кутку ці на кватэры брыгадзіра. Нібыта і Іван Чуклай прысутнічае тут: яго партрэт на сцяне.

— Ён ваяваў у маім злучэнні з першых дзён вайны, — успамінае генерал Корж. — Вынес з бою цяжка параненага мужа Веры Харужай. Адважны хлопец, баявы камсорг. І загінуў ён тут, дзе гараць агні Салігорска...

І генерал, напэўна, будзе разглядаць драбок ружовага сільвініту. Магчыма, у салігорскай хаце ён згадае адважных астурыйскіх шахцёраў, Іспанію, дзе змагаўся з фашызмам. Магчыма, генерал успомніць галодныя дні блакад на Палессі: партызаны на выспачцы, саган над цяпельцам — ні солі, ні хлеба... Драбок сільвініту ў руцэ,— шмат аб чым нагадае драбок солі бываламу воіну.

Прывезлі калійную соль у калгас «Партызанскі край».

— Чуклаеўская! — усміхаецца старшыня Корж.

Мы ледзь пазналі яго без генеральскага мундзіра. Васіль Захаравіч цяпер у звычайным рабочым адзенні. Няўрымслівы сапраўдны чалавек!.. Ён жа мог сягоння спакойна сядзець на пачэснай пенсіі, каратаць вечары ля тэлевізара, паліваць на зялёнай дачы градкі, грэцца на марскім пляжы... Не! Камуністу спакой толькі сніцца. Ён і тут, у роднай палескай глушы, дзе нарадзіўся і ваяваў, робіць жыццё багатым, прыгожым, утульным. Вось ён схіліўся ля тэадаліта на балоце: сівее перад сваім сконам куп'ё яшчэ неасушаных імшараў. Працуе меліярацыйная тэхніка. Сцяною стаяць каноплі, шырока ходзіць збажына...

28 чэрвеня ў цэнтры калгаса «Партызанскі край» будуць адкрываць помнік партызанам і лётчыкам. Помнік ставіцца на сродкі калгаснікаў, верных сяброў тых, паўшых.

Верных сяброў... Колькі іх побач з табою, дарагіх і блізкіх людзей, радавых пераможнага маршу да камунізма... Праз бой і працу ляжыць іх дарога — на гэтай дарозе няма прывалу.

Ка-імір КАМЕЯША

КЛЁКАТ БУСЛІНЫ

Золак развеяў
туманную дымку.
Паспаць бы яшчэ
хоць адну хвіліну.
Але ў пакой,
з вецярком ў абдымку,
Клёкат ускочыў буслины.
І спакойна
ляжаць ўжо не можаш.
Здаецца, ты дзіўным чымсьці
ўстрывожаны.
І напружваеш слых:
Косы клеплюць буслы.
Косы клеплюць буслы.
Ускокваеш хутка
з наспанай пасцелі.
І, свежасцю рання
вымыўшы цела,
Страсаючы сон
і расу,
Хапаеш з павеці касу.
З бабкай глухой
малаток вітаецца,
Калодка ў каленях тваіх
дрыжыць.
У кожным двары,
абуджаны клёкатам раніцы,
Касец малатком грукаціць.
Клёкат гэты
пабудкай вялікай праслыў.
Хай наблізіць
жаданыя дакоскі!
Незвычайна рады буслы—
Клепле косы з буслямі
ўся вёска.

Кніга едзе да чытача. Падарожнічае ў цягніках, ляціць на самалётах, плыве на параходах. Іншы раз, «на кароткіх дыстанцыях», можа адправіцца ў дарогу і вось так, як на гэтым здымку... Таксама няблага, праўда? Важна, што маршрут яе будзе самы правільны і патрэбны — да людзей! Аб гэтым паклапоціцца ўжо Аня Дзенісевіч, бібліятэкарка з калгаса «Перамога» Пухавіцкага раёна.

Фота С. ЧЫРЭШКІНА.

Гераічнае побач

ЛЯ КАР'ЕРА

Пасля рамонтных работ на пустыры застаўся кар'ер, запоўнены вадою. Ля яго і гуляў пяцігадовы Саша Гурскі. Раптам зямля пачала асядаць...

Крык Сашы аб дапамозе пачуў Іван Нікалаеў, работнік Віцебскай міліцыі. Доўга не думаючы, ён кінуўся ў ваду. Па крутым адхоне, які няспынна асыпаўся, ён вынес хлопчыка наверх і зрабіў яму штучнае дыханне. Цяпер Саша адчувае сябе добра, гуляе на вуліцы з дзецьмі.

ГЕРОЙ, ЯКОГА Я ПАЛЮБІЎ

Яго я чакаў даўно. Мне даводзілася, вядома, іграць станоўчага героя. Але, скажам шчыра, у нашай драматургіі апошніх гадоў гэтаму герою не вельмі шанцуе: то аўтары надзяляюць яго поўным асартыментам выдатных якасцей, забываючыся, аднак, удыхнуць у яго справы і словы жыццё, то «прызямляюць» празмерна, пазбаўляючы рамантыкі, высокіх імкненняў, — і зноў-такі не вельмі ў яго верыцца.

І вось Дзмітрый Зорын напісаў драматычную хроніку «Сябры і час», і я сустрэўся са сваім героем.

Вобраз Платава адразу захапіў мяне сваёй вялікай жыццёвай праўдзівасцю.

Платаў — герой станоўчы ў класічным сэнсе гэтага слова. Ён — камуніст, паслядоўны, цвёрды ва ўсіх сваіх учынках, чалавек з незаплямленым сумленнем.

Цяпер у нашай літаратуры ўзнікае цэлая галерэя вобразаў людзей, якія перажывалі перыяд культу асобы. Аўтары звычайна імкнуцца паказаць, што гэта людзі са шчарбінкаю, з псіхалагічным надломам. Але ж па сутнасці ўвесь наш народ перажыў гэты час. І рух, развіццё краіны, будаўніцтва камунізма працягвалася. Вельмі добра, што Дзмітрый Зорын напісаў майго героя, добра разумеючы гэта.

Платаў праходзіць доўгі шлях, пачынаючы яго ў 1934 годзе маладым інжынерам. Ужо тады нараджаецца ў яго вялікая мара — пабудаваць новы горад і назваць яго Вясеннім. І потым, што б ні здарылася ў жыцці краіны, у яго лёсе, ён ніколі не забывае пра сваю мару і не траціць веры ў яе. Платаў — чалавек вельмі дзейны, энергічны, нават нястрымны. І, ведаеце, гэта мне падабаецца. Мне падабаецца, што жыве ён без аглядкі, не трымаючыся за свой штодзённы дабрабыт.

Платаў ненавідзіць тых, хто спрабуе ўхіліцца ад бою ў свой дробязны свет, адсядзецца, перачакаць. Калі несправядліва абвінавацілі, арыштавалі сумленнага чалавека, Платаў грудзьмі стаў на яго абарону.

Вось усім гэтым ён і прываблівае мяне. Мне падабаюцца нават яго слабасці. Так бывае, калі ў чалавеку цябе вабіць галоўнае, яго сутнасць. Платаў, напрыклад, вельмі ўлюбчывы. Але, шчыры і цэласны па натуры, ён здолеў знайсці вялікае пачуццё і пранесці яго праз усе выпрабаванні.

Расстаюся я са сваім героем, калі яму ўжо гадоў пяцьдзесят. Ён пабудаваў горад, пра які марыў. Што ж, ён ужо не малады, але маладосць новых пакаленняў хіліцца да яго. Да яго мэтаімкнёнасці, апытымізму, сілы.

Раман ФІЛІПАЎ,
артыст Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

КРЫЛЫ ГРАМАДСКАСЦІ

Івана Засімавіча Пракопава ў Рэчыцы ведаюць многія. У мінулым кадравы афіцэр, палкоўнік, ён, пайшоўшы ў адстаўку, не застаўся ў баку ад агульнай справы. Амаль тры гады камуніст Пракопаў узначальвае грамадскі аддзел культуры Рэчыцкага гарсавета. За гэты час ён падабраў вялікі актыў добраахвотнікаў. Аддзел стаў сапраўдным рабочым штабам культасветработнікаў горада. Ядро аддзела — яго мастацкі савет. У яго ўваходзяць інструктар гаркома партыі Э. Сусолкін, загадчык гарадской бібліятэкі М. Шараеў, былая актрыса Л. Вельбе, дырэктар Дома культуры Н. Мошкін і іншыя — усяго 17 чалавек.

Кожная секцыя — клубаў і чырвоных куткоў, кіно і паркаў, бібліятэк — мае сваіх актывістаў-аматараў. Апроч таго, у горадзе дзейнічае шэсць галіновых саветаў: савет аматараў музыкі, тэатра, кіно, кнігі... Гэта своеасаблівыя філіялы секцый аддзела. Такім чынам, у грамадскага аддзела культуры сотні актыўных памочнікаў.

...Аднойчы ў мясцовай газеце «Дняпровец» з'явілася невялікая карэспандэнцыя, якая ўстрывожыла актывістаў грамадскага аддзела культуры. У ёй гаварылася аб тым, што за год народны тэатр не падрыхтаваў ніводнага новага спектакля.

Народны тэатр у мінулым быў гонарам Рэчыцы. І вось за апошні час ён страціў былую славу. Мастацкі савет аддзела культуры прыняў меры, каб захаваць тэатр народных талентаў. З Мінска былі запрошаны дырэктар Тэатра юнага гледача Ул. Стэльмах, метадыст Рэспубліканскага Дома народнай творчасці С. Грабеншчыкаў. Усе мясцовыя сілы былі кінуты «на прарыў». І тэатр вярнуўся да актыўнай творчасці.

У час падрыхтоўкі да рэспубліканскай дэкады Дом культуры быў ператвораны ў апорны базавы асяродак. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці Дома культуры стваралі гурткі на тых прадпрыемствах, дзе яны працуюць. Так, на мэблевай фабрыцы пачала кіраваць хорам Анастасся Магрычава, на швейнай — Людміла Куніцкая, на ткацкай — Васіль Чыжык, на метызным заводзе — Алег Іўлечаў.

Галоўнае ў культурна-масавай рабоце — ініцыятыва і настойлівасць. Менавіта гэтыя рысы характарызуюць стыль работы грамадскага аддзела культуры.

...Доўгі час пры клубах прадпрыемстваў два, а то і тры разы на тыдзень наладжваліся танцы. Усе вечары былі падобныя адзін на адзін. Нават самых зацятых аматараў не задавальнялі гэтыя бясконцыя «танцулькі».

Аддзел культуры вырашыў арганізаваць курсы масавікоў. Яны ўжо дзейнічаюць. Выкладаюць на іх на грамадскіх асновах мастацкі кіраўнік гарадскога Дома культуры А. Фінкельберт, касцюмёрка быткамбіната тав. Папова, якая скончыла культасветвучылішча, і метадыст Дома народнай творчасці тав Іваноў. Займаецца на курсах 30 чалавек.

Праведзена ўжо некалькі паказальных вечароў адпачынку ў кінатэатры імя Калініна і ў малой зале Дома культуры. Слухачы курсаў з захапленнем развучвалі з моладзю новыя песні, танцы, наладжвалі літаратурныя і гістарычныя віктарыны. Пераможцы атрымалі прызы.

Гэтыя вечары надзвычай спадабаліся моладзі. І цяпер у клубах заўсёды мнагалюдна, калі там праводзяцца вечары адпачынку.

У паспяховай рабоце аддзела культуры — вялікая частка працы актывістаў. Яны не шкадуюць для патрэбнай людзям справы ні часу, ні сіл, ні ведаў.

Мастацкі кіраўнік гарадскога Дома культуры А. Фінкельберт — чалавек незвычайнага захаплення і працаздольнасці. Па шэсць-восем гадзін іншы раз не знімае ён з пляча акардэон. Працуе з хорам, з салістамі. Потым пачынае агульную рэпетыцыю ансамбля песні і танца «Дняпро». І толькі калі гасне святло ў залах Дома культуры, канчаецца яго доўгі і радасны рабочы дзень.

Тое ж можна сказаць і пра іншых таварышаў, напрыклад. пра баяніста Дома культуры Аляксея Вішняка. Ён здольны музыкант і вельмі любіць свой занятак. То ён на заданню аддзела рэпеціруе з самадзейнымі артыстамі завода дубільных экстрактаў, то яго ўбачыш разам з удзельнікамі агітбрыгады Маладушанскага сельсавета, то ён арганізуе канцэрт калектыву Рэчыцкага санаторыя.

Так, ніштатнаму аддзелу ёсць на каго абаперціся. Людзі падабраліся аўтарытэтныя, працавітыя, улюбёныя ў сваю справу.

Вялікую работу вядзе бібліятэчная секцыя. Актывісты сталі пастаяннымі памочнікамі бібліятэк. З іх дапамогаю школьнікі падрыхтавалі вусныя часопісы: «Жывём мы на вашай планеце ў такі цудоўны век», «Партыі маёй дзякую». Настаўнікі памагаюць выпускаць вусны часопіс «Хачу ўсё ведаць». Пры кожнай бібліятэцы дзейнічаюць саветы аматараў кніг. Актыўныя чытачы сталі грамадскімі распаўсюджвальнікамі кнігі. З вялікай ахвотай працуюць на пунктах кнігавыдачы швачка швейнай фабрыкі камуністка Антаніна Аляксандраўна Шарашкова, рабочы друкарні газеты «Дняпровец» Даніла Сямёнавіч Сінельнікаў, пенсіянерка Таццяна Фамінічна Шыпавец і многія іншыя. А памочнік механіка Рэчыцкага эксплуатацыйнага ўчастка тав. Шапілая, служачы суднабудаўнічай верфі тав. Веннічэнка, рабочы фанера-мэблевага камбіната тав. Авецкі сталі добрымі сябрамі кніжных магазінаў. Яны прадаюць літаратуру жыхарам горада, збіраюць заяўкі на новыя кнігі.

Ніштатны аддзел культуры задумаў ажыццявіць новую цікавую справу: дзе магчыма, перавесці на грамадскія асновы работу культасветустаноў. Не адразу такое зробіш, але пры пэўнай настойлівасці і гэтага можна дасягнуць. Ужо сёння на мэблевай фабрыцы паспяхова сумяшчае дзве пасады — загадчыка клуба і бібліятэкі — тав. Каганская; на заводзе каналізацыйных труб кінамеханік тав. Закрэўскі выказаў жаданне на грамадскіх асновах кіраваць мясцовым асяродкам культуры.

— Недалёка, той час, — гаворыць Іван Засімавіч Пракопаў, — калі ўсё культурнае жыццё краіны будзе будавацца сіламі грамадскасці. І завадатарамі гэтага народнага руху павінны быць мы, камуністы.

А. СУРЫНОВІЧ.

САКАВІЦКІ ІНЕЙ

Анатоль Паўлавіч расплюшчыў вочы і адразу пачуў лёгкі свіст шпака. Ён ніколі не заводзіў будзільнік, бо прачынаўся з першымі галасамі птушак.

Але сёння Анатоль Паўлавіч з сумненнем паглядзеў на падрыхтаваны з вечара эцюднік і адчуў, што ўстаць не можа. Даўно мінуў час, калі было ўсяго трышчаць, і сіла бруіла ў кожным мускуле. Даводзілася араць, касіць, малаціць уручную, але і пасля гэтых цяжкіх работ заставалася энергія, каб хадзіць штодзённа па сорак—пяцьдзесят кіламетраў, аглядаючы кожны кусток ля Вялікага Махро... Цяпер — амаль шэсцьдзесят гадоў. Баляць ногі. Ные спіна. Іншы раз здарыцца прайсці дзесятак кіламетраў — і сэрца пачынае біцца часцей.

У пакоі стала светла. Водбліск сонца трапіў на сцяну і падсвяціў яе. Здавалася, што тут, у доме сельскага мастака Анатоля Паўлавіча Рубановіча — не лета з крыкам шпакоў, буркатаннем галубоў і шчабятаннем ластавак, а пачатак вясны, некранутай, чыстай, выхапленай вокам з розных пунктаў і застыглай у сваёй першапачатковай прыгажосці.

Тут карычневыя пераплетлыя чароціны на балоце, сцяблины маладой асакі; і завадзь ракі з маторнай лодкай на беразе; і густая сінява ночы з размытай у воблаках плямаю месяца; і трывожна-радасныя фарбы заходу сонца, што цягнуцца па небе доўгімі пальцамі, нібы супраціўляючыся цемры, гатовай закрыць стройныя сосны, паміж якімі раскіданы плямы талага снегу. На дарозе— рад высокіх бяроз з сівымі стваламі, ахутанымі хвалямі блакітнага туману. І яшчэ самыя розныя малюнкі, накіды, эцюды — алоўкам, тушшу, маслам. А ў цэнтры сцяны — вялікае палатно.

У каторы раз мастак уважліва разглядае яго. З карціны да яго далятае звінячая цішыня зімовай раніцы. Аранжавая палоска залоціць край неба. Неба ідзе далёка да гарызонту і там, зліваючыся з зямлёй, раствараецца ў лёгкай смузе. Падымаючыся вышэй, жоўты колер раствараецца ў блакітным; блакітны, у сваю чаргу, цямнее, згушчаецца і магутным патокам падае на асляпляльна белы радасны снег; кладзецца на яго густымі сіняватымі плямамі. У ручаі, пакрытым тонкім ільдом, адлюстроўваецца неба, толькі ў іншых, больш інтэнсіўных танах: ад цёмна-блакітнага да ярка-аранжавага. Ля ручая стаяць тры маладыя бярозкі з чорнымі плямкамі на кары. На галінках бяроз — пушысты іней, які хочацца пакратаць рукамі, такі ён «жывы» і незвычайны. Гэта сакавіцкі іней — апошняя прыгажосць зімы. Не кожны год можна бачыць яго на Палессі.

Карціну А. Рубановіч так і назваў — «Сакавіцкі іней». Цяпер яна ў Маскве, на Усесаюзнай выстаўцы самадзейных мастакоў. А адтуль яе адправяць у Італію, на Міжнародную выстаўку. На сцяне ў доме Анатоля Паўлавіча вісіць апошні варыянт «Сакавіцкага інею». Такі лёс мастака — пісаць усё жыццё карціны і не бачыць іх самому: толькі фрагменты, эскізы, варыянты.

Дзе Масква, а дзе — Вялікае Махро!..

Калі глянуць на адміністрацыйную карту Беларусі, то Вялікае Махро не ўбачыш. Яно прытаілася на адной з палескіх дарог на паўднёвым захадзе рэспублікі. За трыццаць кіламетраў ад горада Іванава, там, дзе канчаюцца славутыя пінскія балоты і пачынаюцца глухія палескія лясы, стаіць гэтая звычайная беларуская вёска са зрубамі новых дамоў, пакрытых шыферам і гонтамі; з тэлеграфнымі слупамі, што нясуць электрычнасць ад маленькай калгаснай электрастанцыі да дамоў і фермаў; з высокімі сівымі бярозамі, высаджанымі ўздоўж пясчаных шляхоў, як расказваюць старыя, яшчэ ў часы Кацярыны...

Дзе Вялікае Махро, а дзе — Італія, у якой ніколі не бывае ні такога сакавіка, ні такога інею!..

Да заняткаў у школе яшчэ шмат часу... Анатоль Паўлавіч спрабуе думаць пра школу, пра вучняў, якім ён выкладае маляванне... Сон гатовы мякка заплюшчыць вочы. Але думка яшчэ працуе, варушыцца. Успамінаецца, як адзін раз у жыцці выязджаў ён з Вялікага Махро.

САКАВІК. Карціна А. РУБАНОВІЧА.

Гэта было амаль сорак гадоў назад. Паехаў ён у Варшаву з надзеяй паступіць у Мастацкую акадэмію. Пабыў у акадэміі, паглядзеў калідоры, паслухаў іранічную гаворку гладкіх важных чыноўнікаў, якія адкрыта смяяліся з яго мовы — сумесі польскіх і беларускіх слоў.

Горыч ад тых дзён і цяпер сціскае сэрца.

А цяпер — шэсцьдзесят... Узрост немалы. Можна дазволіць сабе і невялікую слабасць: лішнюю мінуту паляжаць, калі цяжка падымацца. Можна падумаць пра тое, што зроблена і што можна яшчэ зрабіць...

Добры чалавек старшыня калгаса. Возіць, паказвае. Гаворыць пра педагогіку, распытвае пра Леанарда да Вінчы. Заняўся асушкай забалочаных участкаў. Кожны год вырывае ў балота некалькі сот гектараў чарназёмнай зямлі...

На той зямлі — трава з такімі густымі росамі, і так задуменна адлюстроўваюцца воблакі ў вадзе... Там, дзе густы лес сутыкаецца з балотам і пераходзіць у нізкі хмызняк і высокую асаку, цягнецца халодны нізкі туман. Можна ісці па тумане і галава будзе вышэй яго. На ўзроўні вачэй будуць паволі гайдацца цяжкія празрыстыя хвалі. Потым узыдзе сонца і туман заіскрыцца чырвонымі, блакітнымі, ружовымі палосамі. І кожную секунду будуць мяняцца фарбы, радуючы вока чысцінёй, багаццем, неперадавальным каларытам...

Рубановіч так і напіша сваю новую карціну. Гэта будзе сапраўдная палеская раніца з туманам. На дальнім плане з-за цёмнага лесу выходзіць чырвонае сонца. І ўсё загараецца, пакрываецца налётам чырвонага колеру. Сцяблы траў — карычневыя, буйная раса — блакітная. І проста ў туман уваходзіць трактар. Трактарыст — са спіны. Ён і машына—адно цэлае. Трактар чорны, а там, дзе яго асвятляе сонца— барвовы і выразны. З-пад плуга вываротваецца чорная зямля. Сакавітыя вялікія камякі радасна бліскаюць, нібы вітаюць сілу, якая вяртае іх да жыцця. І будзе называцца карціна «Першая баразна»... А можа — «Узнятая цаліна». Але гэта ўжо не мае значэння. Таксама, як і тое, што ў аўтара застанецца толькі апошні варыянт і заменіць сабою «Сакавіцкі іней».

Анатоль Паўлавіч падымаецца з ложка, босымі нагамі ступае на падлогу. Масніцы рыпяць пад крокамі.

Яшчэ праз хвіліну з эцюднікам цераз плячо мастак выходзіць на ганак і асцярожна прычыняе за сабою дзверы, каб не пабудзіць жонку і дачку.

Генадзь БЕКАРЭВІЧ.

АЛЯКСАНДР

З ГАЗЕТЫ, кажаце? Аж з Мінска? Сядайце, калі ласка. Вось тут, да стала. Вам жа запісваць... І да вас, значыць, друг мой сардэчны Мікалай Іванавіч дапяў? Ну што ж, нічога дзіўнага. Такі чалавек. Ад яго чаго хочаш можна чакаць. Абурае мяне толькі нахабства—вінаваты ж і моцна. Калі камісіі розныя прыязджалі, хоць бы адна душа за яго заступілася! Падумай, памазгуй, чаму гэта так. Дык не! Скардзіцца адно, ды скардзіцца, нібы і праўда ваўкі вакол яго, і ён адзіны — бяскрыўдная авечка...

Ніхто, кажаце, не скардзіўся? Не праз Кірыенку вы, значыць, да мяне? А праз кага? Проста так, пацікавіцца? Мною пацікавіцца? Гэта хто вам параіў? Парторг? Дзівак, ды і толькі! Вядома, дзівак. Семсот чалавек народу ў канторы, а ён пасылае да Хабарава. Няўжо не разумее, што вашаму брату, карэспандэнту, іншае патрэбна. Пасля такой дарогі не з пустым блакнотам жа вяртацца. Ты ўзваж, паразважай, падкажы гісторыю якую прываблівую, — семсот чалавек народу, няўжо не знайшлася б! А ён — да Хабарава! Што той Хабараў можа расказаць, калі за вышкаю сваёю і свету не бачыць. Пра тое, як дапёк яму Кірыенка, ці што? Бачыце ж, нават вас за чарговага правяральшчыка прыняў.

Ды гэта я жартам, вядома. Не варты той Кірыенка нашай з вамі гаворкі. Як успомню пра яго, дык нібы жабу глытаю, дальбог! І, скажыце, бываюць жа такія... не ведаю, як і назваць! Кожны яму ворагам здаецца, кожнага б пакрыўдзіў, прынізіў, зняважыў... Ён у нас бурыльшчыкам працаваў, старшым быў па змене, ці, як у нас кажуць, па вахце. Дык, паверыце, проста плакалі некаторыя, як прызначыш у адну з ім вахту!

У мяне з ім наперакос усё пайшло праз адносіны яго нялюдскія да працы. Такі ўжо я маю характар, — мяркуй

Калінкавіцкія НАВІНЫ

ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У Калінкавічах праведзена тэарэтычная канферэнцыя на тэму «Роля літаратуры і мастацтва ў маральным выхаванні савецкага чалавека».

З дакладам «XXII з'езд КПСС аб ролі літаратуры і мастацтва ў выхаванні камуністычнага светапогляду і камуністычнай маралі ў савецкіх людзей» выступіў настаўнік Р. Лаўчак. Настаўніца В. Сопат зрабіла даклад «Мастацтва як адна з форм ідэалогіі. Рэакцыйная сутнасць сучаснага буржуазнага мастацтва».

Удзельнікі тэарэтычнай канферэнцыі праслухалі даклады «Ленінскі прынцып партыйнасці літаратуры і мастацтва. Крытыка фармалістычных тэндэнцый у савецкім мастацтве», «Будаўніцтва камунізма і задачы савецкай літаратуры і мастацтва». З гэтымі дакладамі выступілі В. Бурак і В. Гарбачова.

КЛУБ КНІГАЛЮБАЎ

Пры раённай бібліятэцы створан клуб аматараў кнігі. Тут будуць сустракацца выкладчыкі, рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, вучні старшых класаў.

На першым пасяджэнні клуба абмеркаваны раман савецкага пісьменніка Аляксандра Андрэева «Рассудзіце нас, людзі». У наступны раз члены клуба абмяркуюць кнігу лаўрэата Ленінскай прэміі Ч. Айтматава «Таполік мой у чырвонай касынцы».

ПАСЫЛКІ Ў КАЛГАСЫ

Работнікам кніжнага магазіна райспажыўсаюза прысвоена ганаровае званне калектыву камуністычнай працы. Да распаўсюджання літаратуры тут прыцягнут шырокі актыў пакупнікоў.

Магазін трымае цесную сувязь з калгасамі, сельскімі бібліятэкамі, падбірае па іх заяўках літаратуру. Гэтымі днямі, напрыклад, былі падабраны і накіраваны ў калгасы спецыяльныя тэматычныя бібліятэкі для працаўнікоў вёскі: брашуры і кніжкі аб перадавым вопыце жывёлаводаў і механізатараў, аб арганізацыі працы ў паляводстве і на фермах.

Калі раней настаўнікі, дырэктары школ вымушаны былі прыязджаць у раённы цэнтр, каб набыць падручнікі для вучняў, дык цяпер магазін па заяўках сам завозіць усё неабходнае ў сельскія школы.

ЗА ВЁСКУ КАМУНІСТЫЧНАГА БЫТУ

Партыйная арганізацыя, інтэлігенцыя вёскі Ліпава разгарнулі рух за вёску камуністычнага быту. Грамадскасць аб'явіла барацьбу супроць хуліганства, дармаедства, нядбайных адносін да сацыялістычнай маёмасці. У вёсцы праведзен першы нядзельнік па добраўпарадкаванню парку.

КАНЦЭРТ КЛАСІЧНАЙ МУЗЫКІ

Закончыўся навучальны год у Калінкавіцкай музычнай школе. Вынікам яго з'явіўся канцэрт, які адбыўся ў раённым цэнтры. Гэта быў першы выпуск юных музыкантаў школы. Яна мае свой філіял у вёсцы Бабровічы, дзе таксама вучыцца каля 30 дзяцей.

Доўга ў зале гарадскога Дома культуры гучала музыка. 26 навучэнцаў атрымалі пахвальныя лісты, 29 — каштоўныя падарункі.

Ю. ПОЛЯК.

А ПЕСНЯ АД СЭРЦА

Песня гэтая, надзвычай напеўная, прасякнутая глыбокім лірычным пачуццём, нарадзілася на беларускай зямлі. Вы толькі прыслухайцеся да яе задушэўнай і шчыраў мелодыі, з плаўнымі пераходамі і пераменным рытмам, да самога літаратурнага тэксту і адразу пагодзіцеся, што песня сапраўды наша, беларуская як па інтанацыйным складзе музыкі, так і па сваім паэтычным вобразным змесце. Гэта — тыя «Ручнікі», якія так палюбіў народ і якія цяпер можна пачуць амаль у кожным раёне Беларусі.

Гучыць песня. І перад намі нібы ажывае цудоўная карціна з сельскага быту, поўная народнай паэзіі і прыгажосці.

Хто ж аўтар «Ручнікоў»? Напэўна, які-небудзь прафесіянальны кампазітар, вопытны музыкант? Зусім не. Стварыў гэтую песню на словы маладой паэтэсы Веры Вярбы выкладчык беларускай мовы ў Полацкім педвучылішчы Мікалай Макаравіч Пятрэнка. Здавалася б, якое дачыненне мае гэты чалавек да музыкі, што ў яго ёсць з ёю агульнага? Але, аказваецца, мае дачыненне і самае непасрэднае. У дзяцінстве ён скончыў Мазырскую музычную школу па класу домры (бацька—цудоўны дамрыст-самаўчука першы вучыў сына іграць на гэтым інструменце). А будучы студэнтам Мінскага педагагічнага інстытута, Мікалай Пятрэнка паспяваў сумяшчаць вучобу з работаю ў аркестры народных інструментаў Беларускага радыёкамітэта. Там ён набыў сталыя прафесіянальныя навыкі як аркестрант, там яму прывілі сапраўдную любоў да музыкі. І яна стала для яго другім прызваннем у жыцці. Дзе б ні працаваў Мікалай Макаравіч: завучам педвучылішчаў у Петрыкаве, Лепелі, Ветрынскай школе-інтэрнаце або выкладчыкам Полацкага педвучылішча, ён заўсёды лічыў сваім абавязкам вучыць юных выхаванцаў не толькі роднаму слову, але і музычнай грамаце, тэхніцы ігры на домры.

А як жа песні? Калі паспявае іх ствараць нястомны настаўнік, заклапочаны вучэбнымі і сямейнымі справамі? Гэта творчы сакрэт, і ніводзін кампазітар не скажа, як нараджаюцца яго мелодыі і колькі трацціна на гэта намаганняў і часу. Непераадольнае жаданне пісаць музыку паявілася ў Мікалая Макаравіча зусім выпадкова, калі ён працаваў яшчэ ў Петрыкаве. Там ён разам з выкладчыкам спеваў і музычнай граматы М. Ларковым арганізаваў секстэт домр, які часта выступаў на самадзейных вечарах у сваім раёне і нават выязджаў з канцэртамі ў Мазыр.

І вось неяк даведаўся Ларкоў, што ў педвучылішчы аб'явіўся свой «кампазітар».

— Ты што ж, братка, такі сціплы: напісаў, кажуць, нейкую «Польку» і «Мазурку» і ад усіх утойваеш. Хіба так сябры робяць? — з жартаўлівым дакорам звярнуўся да Пятрэнкі Ларкоў.

— Добра, калі-небудзь пакажу...

— Ды не калі-небудзь, а паказвай зараз. Можна ж паспрабаваць распісаць ноты па галасах для нашага секстэта і выконваць творы ў канцэртах. Згодзен?..

Аднак музыкант-аматар так і не адважыўся тады абнародаваць першыя «спробы пяра» — палічыў іх вельмі слабымі, не вартымі грамадскай увагі. І толькі праз некалькі гадоў Мікалай Пятрэнка, захапляючыся па-ранейшаму любімым заняткам, вырашыў, нарэшце, паказаць свае музычныя «опусы» спецыялісту.

Аднойчы ў Віцебску склікалі абласны семінар самадзейных кампазітараў, у лік яго ўдзельнікаў трапіў і М. Пятрэнка. Кансультаваць творы аматараў прыехаў з Мінска беларускі кампазітар Р. Пукст. Дайшла чарга да М. Пятрэнкі.

— Ну, што вы там стварылі, малады чалавек, пакажыце, калі ласка!— сказаў Рыгор Канстанцінавіч, запрасіўшы музыканта-аматара сесці побач з сабою ля фартэпіяна.

Нясмела і вельмі хвалюючыся, як вучань на ўроку перад настаўнікам, паклаў М. Пятрэнка на пюпітр некалькі спісаных лісткоў нотнай паперы. Гэта былі тры яго песні — «Ой, старонка мая ты, лясная» (словы А. Астрэйкі), «Каб мне стаць» (словы П. Броўкі) і «Веснавая» (словы А. Русака). Кожную з іх Р. Пукст па некалькі разоў прайграў на фартэпіяна, уважліва пазнаёміўся з іх зместам і толькі пасля таго падзяліўся сваімі думкамі.

Дзве першыя песні — «Ой, старонка мая ты, лясная» і «Каб мне стаць» зрабілі на кансультанта добрае ўражанне сваім патрыятычным гучаннем, яркім грамадзянскім напрамкам. Абедзве яны, прасякнутыя любоўю да роднай краіны, якую называе партызанкай «усіх народаў савецкіх сям'я», нагадваюць некаторыя ўзоры народнай творчасці.

А «Веснавая» не спадабалася Р. Пуксту. Ён так проста, не ўтойваючы, і сказаў пра гэта на семінары:

— Паспрабуйце зрабіць песню неяк інакш. Не трэба вельмі часта мяняць рытм — інакш гэта толькі стварае ў музыцы стракатасць і разнастайнасць, лагічна не адпавядае ўсяму зместу тэксту.

Самадзейны аўтар быў ад душы рады заўвагам і парадам вопытнага майстра. Рыгор Канстанцінавіч згадзіўся сам гарманізаваць песню «Ой, старонка мая ты, лясная», і яна потым у яго апрацоўцы ўвайшла ў друкаваны зборнік «Песні Віцебшчыны».

Пасля гэтага павучальнага семінара М. Пятрэнка пачаў смялей і больш упэўнена адчуваць сябе на ніве музычнай творчасці. Аднак ён па-ранейшаму заставаўся сціплым, стрыманым чалавекам, ніколі не любіў хваліцца перад сябрамі сваімі поспехамі. Мікалаю Макаравічу шмат памаглі творчыя кансультацыі вядучых беларускіх кампазітараў Р. Пукста, Д. Лукаса, П. Падкавырава. Як адзін з актыўных народных стваральнікаў песень ён цяпер прысутнічаў на ўсіх семінарах і злётах самадзейных аўтараў.

Народны стваральнік песень! Прэтэндаваць на такое «званне» можа толькі той музыкант-аматар, хто сваім самабытным талентам служыць народу ва ўсіх яго гераічных справах і здзяйсненнях, хто заўсёды крочыць у нагу з жыццём і, абапіраючыся на багаты фальклорны матэрыял, на традыцыі савецкай масавай песні, адлюстроўвае дух эпохі, стварае вобразы нашых сучаснікаў. Многія творы М. Пятрэнкі глыбока патрыятычнага зместу былі прысвечаны надзённым тэмам нашай рэчаіснасці. Так, у чатырохгалосым хоры «Добры дзень» (словы П. Варанько), які мае характар паходнага баявога маршу, услаўляецца загартаваная і выпрабаваная ў няжкай барацьбе з ворагамі дружба ўкраінскага і беларускага народаў.

Шырокае распаўсюджанне атрымала «Святочная» на словы А. Русака, складзеная аматарам да 40-годдзя БССР. Гэтая песня выконвалася ўдзельнікамі зводнага хору Віцебшчыны на першай Усебеларускай дэкадзе самадзейнага мастацтва і заваявала другую прэмію. Музыка «Святочнай» інтанацыйна пераклікаецца з некаторымі беларускімі народнымі напевамі. І хоць напісана яна ў мінорнай танальнасці, але гучыць на дзіва бадзёра, жыццярадасна і ўрачыста, услаўляючы наш цудоўны край і яго працавітых людзей.

Тэмы патрыятызму, адданасці партыі, народу адлюстроўвае і рад іншых твораў М. Пятрэнкі. Сярод іх — «Ленінскія частушкі» са свежасцю і разнастайнасцю метрарытмікі, змешаны, з элементамі паліфоніі, хор «Беларусі мілай» і «Дума пра Карбышава». Гэтыя тэмы, найбольш актуальныя і значныя ў нашы дні, заўсёды хвалююць аматара. Бо полацкі выкладчык, на долю якога ў мінулую вайну выпала столькі выпрабаванняў, вельмі добра ведае цану любві да Радзімы, ведае, як страшэнна цяжка бывае чалавеку далёка ад родных месц, ад сям'і.

У першыя дні гітлераўскага нашэсця на нашу краіну савецкі воін М. Пятрэнка, цяжка паранены і кантужаны, трапіў у палон да немцаў. Пацягнуліся жахлівыя месяцы фашысцкай няволі. Разам з іншымі савецкімі ваеннапалоннымі хлопца пасадзілі за калючы дрот канцэнтрацыйных лагераў, а пасля двух няўдалых уцёкаў кінулі ў гестапаўскую турму. Ён не раз быў на краю пагібелі і толькі нейкім цудам выратаваўся ад смерці. Аднак ні голад, ні страшэнныя пакуты і здзекі— нішто тады так не прыгнятала і не мучыла маральна непакоранага савецкага чалавека, як разлука з любімай Айчынай.

Такое ніколі не забываецца ў жыцці і не сціраецца з чалавечай памяці. М. Пятрэнка не любіць дзяліцца ўспамінамі пра мінулае, — лепш няхай пра яго расказваюць песні. І таму, калі знаёмішся з «Думаю пра Карбышава», прысвечанай неўміручаму подзвігу савецкага генерала, адчуваеш, што яна пісалася крывёю сэрца. Магчыма, з музычнага боку ў гэтай песні не ўсё ўдалося аўтару (хацелася б, напрыклад, бачыць больш мужнасці ў сярэдняй частцы), але ў ёй вабіць надзвычайная шчырасць і ўсхваляванасць расказа пра смелага рускага воіна, які атрымаў маральную перамогу над ворагам.

Значнае месца ў творчасці самадзейнага кампазітара займаюць бытавыя і лірычныя тэмы. Дзве песні— «У калгасе сёння свята» і «Я на выстаўцы была» ён прысвяціў жыццю калгаснай вёскі. Першая з іх, жывога танцавальнага складу, вытрыманая ў рытме беларускай полькі, адлюстроўвае радасны святочны настрой сельскай моладзі.

«Я на выстаўцы была»—своеасаблівы вакальны маналог маладой звяннявой-ільнаводкі, якая пабывала на Усесаюзнай выстаўцы ў Маскве. Узрушаны душэўны стан расказчыцы перадасцца ў музыцы светлай мажорнай мелодыяй, частай зменай рытмаў. Гэтая песня напісана ў народным стылі, у форме сучасных прыпевак.

Лірычныя песні самадзейнага аўтара вызначаюцца народнасцю музыкі, прастатой і выразнасцю паэтычнага зместу. Гэта не тыя інтымна-сентыментальныя і саладжавыя лірычныя творы пра нясбыўныя мары, пра разбіты лёс і незразумеўныя пакуты, якія літаральна перапаўняюць нашу эстраду і прапагандуюцца амаль у кожным канцэрце. Вакальная лірыка М. Пятрэнкі — чыстая і высакародная, герої яго песень дарэмна не пакутуюць, не падазраюць адзін аднаго ў здрадзе, яны кахаюць па-сапраўднаму, горача і шчыра.

Проста і разам з тым пранікнёна расказваецца пра дзявочае шчасце ў песні «Заспявала радасць». А вазьмі-це цудоўныя «Ручнікі», вакальныя дуэты «Вішні спелыя», «Вяночак»— усё гэта лірыка высокіх пачуццяў і светлых імкненняў, без суму і жалю. У гэтых песнях побач з мяккімі лірычнымі інтанацыямі адчуваецца вясёлы жарт, дзявочая гарэзлівасць.

...Жыве ў старажытным Полацку выкладчык беларускай мовы, вучыць дзяцей і піша песні. Радасць мастацкай творчасці ў яго непарыўна звязана з асноўнай прафесіяй. Напэўна, веды ў галіне роднай літаратуры памагаюць яму дасканала выбіраць паэтычныя тэксты, па-сапраўднаму адчуваць музыку слова. М. Пятрэнка даўно працуе над вакальным творам пра родны горад, пра яго прыгожую будучыню. Першыя спробы не ўвянчаліся поспехам. Але аматар не траціць надзеі, ён працягвае свае творчыя пошукі. І, магчыма, ў адзін цудоўны дзень народзіцца на берагах Заходняй Дзвіны яшчэ адна песня самадзейнага аўтара, якая будзе ісці ад самага сэрца, з глыбіні душы.

Георгій ЗАГАРОДНІ.

АДКАЗНАСЦЬ

Па-рознаму ўспамінаюцца людзі, якіх ты сустракаў, якіх ты ведаў. Адны ўявяцца невыразна, як у тумане, і тут жа забудуцца, не закрануўшы ніводнай струны тваёй душы. Вобраз другіх можа затрымацца на нейкі час, але ты ад гэтага нічога, апрача непрыемнага пачуцця, не атрымаеш. Лепш ён зусім не ўспамінаўся б, гэты чалавек, сустрэцца з якім ты колісь меў няшчасце.

Іншая справа — калі ўспамінаюцца людзі, ведаць якіх ты лічыў заўсёды за радасць, за гонар. «Прапісаны» яны, гэтыя людзі, недзе ў самых светлых закутках памяці і ўспамінаюцца лёгка і радасна. І прытым, заўсёды дарэчы. Можа быць, якраз у той момант, калі трэба пераканацца ўнутрана яшчэ раз, што ёсць такія людзі ў нашым жыцці! Як жаданы госць у доме з'яўляюцца такія людзі ў памяці. Як жаданы госць, як верны спадарожнік, як друг. І яшчэ — як прыклад для цябе, даходлівы, яркі, жывы прыклад для твайго жыцця.

Так мне ўспамінаецца Хвядос Цімафеевіч Румянцаў...

Пачалося маё знаёмства з ім не зусім звычайна. Аднойчы — я тады працаваў у рэдакцыі рагачоўскай газеты «Камунар» — мы атрымалі з новай поштай вершы. Я прабег іх вачыма і... не адклаў у бок з горкім усведамленнем, што вось трэба будзе даваць яшчэ адзін адказ: «Паважаны таварыш! Вашы вершы, на жаль...» Вершы заслугоўвалі ўвагі. Гэта не былі практыкаванні чалавека, якога раптам «асяніла» думка стаць паэтам. Па-першае, сціслыя, нешматслоўныя вершы невядомага мне аўтара былі зроблены патрабавальнай рукой, амаль з прафесіянальным майстэрствам. Па-другое, адчувалася, што ўзніклі яны як вынік настойлівага жадання выказацца, што аўтар не мог раўнадушна прайсці міма таго, аб чым ён піша. Помню, у адным вершы, — называўся ён «Мудры мой радыкуліт» — тонка высмейваліся людзі, якія хаваюцца, як за шчыт, за розныя «ліпавыя» хваробы і медыцынскія даведкі. Другі верш «Інерцыя» выкрываў прадаўца, які так спрытна прымяняе законы інерцыі для абважвання пакупніка.

Я неяк адразу адчуў: за вершамі стаяў чалавек з неспакойнай душой, з жывым мудрым гумарком і, вядома, з літаратурнымі здольнасцямі, — выпадкова, ні з таго, ні з сяго, такія вершы не напішаш.

Пад вершамі стаяў подпіс: «Хв. Румянцаў».

— Румянцаў? Хвядос Цімафеевіч? Дык гэта ж мой настаўнік, ён мяне вучыў. — І мой таварыш па працы, чытаючы вершы, дадаў яшчэ: — Ты хіба не ведаеш гэтага чалавека? Шкада. Такіх людзей, браце, трэба ведаць. Кажу гэта не толькі таму, што Румянцаў — мой колішні настаўнік. Настаўнікі, ведаеш, розныя бываюць. Хвядос Цімафеевіч адносіцца да тых, хто сапраўды сее разумнае, добрае, вечнае. І увогуле чалавек, што трэба. Вось бачыш, вершы піша. Піша не для забавы, не таму, што няма чаго рабіць, а таму, што хоча нешта рабіць. Гарыць чалавек...

Пасля такой атэстацыі пачуццё сімпатыі да нашага новага аўтара ў мяне яшчэ больш умацавалася.

А праз некалькі дзён я ехаў у мястэчка Журавічы. Былі розныя справы, і яшчэ было жаданне па знаёмліцца з настаўнікам Румянцавым. Прыехалі, сышоў з аўтобуса і спытаў у першай, якая трапілася мне, местачковай жанчыны:

— Ці не ведаеце вы, дзе жыве настаўнік Хвядос Цімафеевіч Румянцаў?

— Дзіна што ведаю. Яго тут усе ведаюць, — усміхнулася жанчына. — Толькі вам лепш зайсці ў школу. Хвядос Цімафеевіч там часта затрымліваецца позна. Я ведаю... — і жанчына, як бы ў пацвярджэнне сваіх слоў, зноў усміхнулася добрай усмешкай.

А потым з такой жа ўсмешкаю гаварылі мне ў школе пра Румянцава і яго калегі. Гаварылі і папярэджвалі:

— Ён, можа, і дома. А можа, яшчэ дзе—у сельсавеце, у Доме культуры ці ў праўленні. Гэта такі чалавек...

А потым я гаварыў са старшынёй мясцовага сельсавета, цікавым чалавекам-энтузіястам Галінай Навумаўнай Крамковай, і яна, расказваючы пра сваіх лепшых дэпутатаў і актывістаў, гаварыла: «Узяць хаця б Хвядоса Цімафеевіча, ведаеце такога?..»

Зайшоў у сельскі Дом культуры, у бібліятэку і даведаўся, што Хвядос Цімафеевіч піша тэксты для радыёгазеты, удзельнічае, нягледзячы на свой узрост, у мастацкай самадзейнасці, выступае на вечарах пытанняў і адказаў, дапамагае бібліятэцы праводзіць канферэнцыі і вечары...

Нешта надзвычай цікавае расказваюць пра яго ў праўленні калгаса. Нядаўна было нашыранае пасяджэнне праўлення. Прысутнічалі на ім дэлегаты ад калгаса, з якім спаборнічаюць журавіцкія хлебаробы. І вось першае слова было дадзена Хвядосу Цімафеевічу Румянцаву. Выступленне яго было не зусім звычайным: ён чытаў свае вершы. Спачатку тыя, што прысвячаліся калгасным маякам,— напрыклад, маладому брыгадзіру Лідзіі Клімавай. Затым Хвядос Цімафеевіч, як кажуць, змяніў тон і стаў чытаць сваю сатыру. Дасталося тут і дрэнным гаспадарам, і п'яніцам, і самагоншчыкам, і бацькам, якія не хочуць выхоўваць дзяцей. Было ца тым праўленні і доплескаў, і смеху, і розных рэплік. Старшыня быў задаволены, — паэтычная справаздача аб справах у арцелі ўдалася. Ён паглядаў на гасцей: што, у вас на праўленні такіх выступленняў не бывае?

Помню, у той дзень з самім Хвядосам Цімафеевічам я так і не сустрэўся. У мястэчку яго не было. Ён пайшоў — ці як настаўнік, ці як дэпутат — у суседнюю вёску. Убачыліся мы з ім упершыню на нарадзе селькораў. Я слухаў яго выступленне, потым гутарыў з ім і адзначыў сам сабе: цэльная натура, адкрыты, мужны чалавек. Потым Румянцаў заглянуў неяк да нас у рэдакцыю. Заглянуў першы раз, хаця часта друкаваўся. Калі мы сказалі яму пра гэта, ён адказаў: «Навошта дакучаць». Гэта быў надзвычай сціплы чалавек, як і ўсе тыя людзі, якія не носяцца са сваім «я», а заняты нечым больш важным.

Сустракаліся мы з Румянцавым і яшчэ раз у яго родных Журавічах. Праўда, зноў-такі неяк бегла, мімаходзь. Грунтоўна, адзін на адзін пагутарыць мне з ім не давялося. Інакш, магчыма, я пісаў бы нарыс пра яго жыццё, пра яшчэ адзін непаўторны чалавечы лёс. Але нарыс я не пішу. Я не задаваўся такой мэтай. Я ўзяўся пісаць гэтыя нататкі для таго, каб аддаць даніну павагі чалавеку, якога павінны ведаць другія. І яшчэ, можа, для таго, каб адказаць самому сабе на пытанне, якое ў мяне ўзнікала кожны раз, калі я сустракаў людзей накшталт Румянцава: «Якая вызначальная рыса іх характару? Што надае ім гэту энергічнасць, гэты энтузіязм, гэту акрылянасць, робіць іх жыццё такім дзейным і мэтанакіраваным?». Я ведаў, што не асабістымі меркаваннямі і разлікамі кіруюцца яны, што яны далёкія ад думкі пра цёплае месца, пра славу. Калі я сказаў неяк Хвядосу Цімафеевічу, што яму варта было б сабраць свае лепшыя вершы і прапанаваць выдавецтву, то ён без асаблівай радасці сустрэў маю «ідэю». «Вы так думаеце? — перапытаў ён мяне. — Наўрад ці варта... І раней я не думаў пра кнігу, хаця не раз браўся за пяро, а цяпер тым больш». Я зразумеў, што дарэмна пачаў гэтую размову. І па-думаў тады: якое пачуццё прымушае чалавека браць так многа на свае плечы, так многа рабіць для людзей? Гатовыя, шаблонныя адказы, якімі часта карыстаюцца ў такіх выпадках нарысісты, неяк не падыходзілі ў дадзеным выпадку, не стасаваліся да канкрэтнага чалавека.

Цяпер, калі я пісаў гэтыя нататкі, думаў над імі, адказ прыйшоў: пачуццё адказнасці. Адказнасці за агульную людскую справу, за ўсё і за ўсіх. Нехта сказаў: «Быць чалавекам — гэта адчуваць сваю адказнасць». Яно, відаць, сапраўды так.

Хвядос Цімафеевіч Румянцаў адчувае адказнасць, і гэта зрабіла яго настаўнікам, якога шануюць вучні і іх бацькі, гэта прымушае яго брацца, калі трэба, за пяро і станавіцца паэтам, гэта раскрыла ўсе яго лепшыя якасці і магчымасці, зрабіла яго сапраўдным чалавекам...

Па рознаму ўспамінаюцца людзі, якіх ты ведаеш. Такія, як Хвядос Цімафеевіч, успамінаюцца светла і радасна. І нам нельга забываць пра іх, трэба часцей іх успамінаць. Бо яны і ёсць тыя людзі, што, як сказаў паэт, пракладваюць шлях «ад сённяшніх пасеваў да жніва заўтрашняга дня».

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Есць людзі, якія нясуць з сабою свята. Аўгуст Іларыёнаў — адзін з такіх людзей. Сам ён зваршчык, жыве ў Ельску. Участкі геалагічнай арганізацыі, дзе ён працуе, размешчаны амаль па ўсім Палессі. І калі Аўгуст прыязджае на які-небудзь участак — там заўсёды маленькае свята. Вельмі ж добры спявак, музыкант і арганізатар гэты хлопец! Ёсць паблізу ўчастка калгасны клуб — значыць, вечарам там абавязкова будзе канцэрт.

Гэты здымак зроблены, калі Аўгуст ішоў на такі канцэрт у вёску Астражанку Мазырскага раёна.

Аўгуст завочна скончыў Магілёўскае культасветвучылішча, а цяпер вучыцца ў Мазырскім педагагічным інстытуце.

ВЯНОЧАК

ДУЭТ

Словы В. ВЯРБЫ
Муз. М. ПЯТРЭНКІ

І табе, і сабе з палыночку
Я саўю, я спляту па вяночку.

ПРЫПЕЎ:

Ой ты, шэры палын-палыночак,
Будзе горкі з цябе мой вяночак.

У вянок упляту не званочкі;
А свае лепей сінія вочкі.

ПРЫПЕЎ:

У вянок замест белай рамонкі
Упляту лепей голас я звонкі.

ПРЫПЕЎ.

Хадзі, мілы, хадзі, мой спакусны,
Я з вяночкам аддам табе вусны.

ПРЫПЕЎ.

Ой ты, горкі палын-палыночак,
Ой, салодкі мой будзе вяночак.



ХАБАРАЎ, БУРАВІК

колам ці здзекам здаецца. Мерае ж усіх на ўласны аршын, думае, калі пасварыліся з ім напярэдадні за тое, што адмовіўся я афармляць яму фальшывыя нарады, дык апроч каменя за пазухай, нічога яму не нясу...

Сэрца маё, я ўжо сказаў вам, як прадчувала нядобрае. І такі нядобрае здарылася. Выпаў неяк зноў на вахту Кірыенкі пад'ём. Зноў ён не ў гуморы праз гэта працаваў: рукі так і ходзяць туд-сюд. І нахадзілі: рабочаму нагу ключом сталёвым паламала... Ляжыць той, небарака, зварухнуцца не можа, а Кірыенка не за тое хапаецца, каб чалавеку памагчы, а за тое, каб сляды вінаватасці сваёй хутчэй схаваць. Паганец, ну што ты зробіш!..

Бачыце, як яно атрымліваецца: сказаў, што не будзем пра Кірыенку, а сам нагаварыў пра яго бочку арыштантаў. Смыліць мне гэта надта. Не цярплю, калі вось так, нібы праз чорныя акуляры, на таварышаў, на работу сваю, на ўвесь белы свет глядзяць. Шырасць люблю харошую, яснасць і праўду. Калі не маеш іх у сэрцы — кепска жывеш!..

ДАРУЙЦЕ, адысціся давялося. Не ў пару вы трошкі пад'ехалі, не крыўдуйце, вядома. Цэментаж у нас сёння. Машын, бачыце, колькі падышло. Самыя розныя, проста як у Маскве на выстаўцы дасягненняў! І «мазы» вам тут з зубрам на радыятары, і «казы» з мядзведзем крывалапым (на Валагодчыне, у вёсцы маёй такіх мядзведзяў «гаспадарамі» завуць), і «кразы» — волаты-цэментазмяшальнікі, і трактары... Зараз як загудуць, дык толькі за вушы, калі нязвычны, трымайся. Многа не нагаворыш тады — не чуваць.

Цэментаж у нас сёння. Апошні. Вам гэтае слова мала што гаворыць, а нашаму брату, буравіку-глыбінніку, ого-го! Апошняе, значыць, генеральнае наступленне. Фінальны акорд, як сказаў неяк прыяцель мой інжынер. Замацуем, зацэментуем праходы, каб лягчэй было дыпламатычную гутарку з глыбінёй весці, — ёсць, маўляў, там нафта, ці няма, думае яна людзям служыць, ці не думае, — і лічы, што наша справа закончана. Прыйдуць сюды іншыя — выпрабавальнікі. А мы — мы пойдзем на новае месца, якое выбралі ўжо для нас геолагі, пабудуем там такую ж прыгажуню вышку, абсталюем яе чараўнічымі маторамі і апаратамі — і пачнём сваімі свечкамі разведку нанава. Кантора ж наша так і называецца — кантора разведачнага бурэння...

Колькі я спусціў гэтых свечак з таго часу, як падаўся ў буравікі! Сашрубаваць іх усе ў адну, то да самага нутра планеты, мусіць, дастала б. Дванаццаць жа гадоў бурыльнага стажу!.. Тут, на Палессі, ужо дзесяць гадоў. З падсобнага рабочага пачынаў, потым у памочнікі бурыльшчыка выбіўся, потым, глядзіш, і самога бурыльшчыкам паставілі. А з ліпеня мінулага года самастойна вяду буравую. Вось гэтую самую. На майстра экзамены летась здаваў — кніжак адолеў процьму!..

Лічуся цяпер, значыць, інжынерна-тэхнічным персаналам. Атрымліваю не ад выпрацоўкі, як прывык, а цвёрды аклад. Паперак розных чытаю і пішу цэлую канцылярыю. Як ні кажы, амаль трыццаць чалавек пад загадам, за гэткую махіну-вышку адказнасць нясу маральную і матэрыяльную... Але, па праўдзе кажучы, як адчуваў сябе рабочым, так і адчуваю. Калі трэба, скажам, грузіць машыну — кідаюся першым. Калі запарка якая на буравой, магу і за бурыльшчыка пастаяць, і за памочніка яго, і падсобніку памагчы не пагрэбую. Расказвалі мне пра аднаго духа, такога ж, як я, практыка. Таксама высунулі ў майстры. Дык не паспеў ён прыняць буравую, як такой напусціў на сябе пыхі, — не падступішся! Ужо ён і на вышку лішні раз не падымецца — брудна там. За лепшае лічыць здалёк паказваць ды камандаваць.

Мне гэта смешна, дальбог. Смешна і крыўдна. Каб проста з дурасці несвядомай такое панства... Дык не ж, ведаю я гэтага прайдзісвета. Рады, што звання рабочага адкасаўся, дубіна. За начальніка, за інтэлігента сябе ставіць. Думае, калі рукі цэлы дзень не запэцканы, дык вышэйшай пароды чалавекам зрабіўся. Не ўцямію сваімі курынымі мазгамі, што няма на белым свеце звання вышэйшага ад рабочага!

Перад самай вайною, падлеткам, прыехаў я з Валагодчыны сваёй у Ленінград, у раменнае вучылішча. У той час яны толькі адкрыліся. Колькі жыць буду, не забудуся, з якім харошым пачуццём пазіралі нам услед ленінградцы. Ідзём мы па вуліцы, гімнасцёркамі, спражкамі ды шапкамі форменнымі фарсім, а прахожыя ўсміхаюцца, падміргваюць кожнаму з нас: вышэй, маўляў, насы, рабочая змена — надзея і будучыня краіны!..

От з таго часу, паверыце, як працую, то сядзіць недзе ў глыбіні такое адчуванне, нібы і цяпер глядзяць на мяне чыесьці харошыя і патрабавальныя вочы: маўляў, ну, як ты там, надзея і апора краіны? Глядзяць і бачаць наскрозь. І ўжо ніяк не магу я ні зманіць, ні злайдачыць. Сам не магу і другім не дазваляю. За дванаццаць гадоў, што працую, ніводнага прагулу ці спазнення. І брыгадзе сваёй спуску не даю. Не ўсім гэта, вядома, да спадобы. Бывалі ў мяне тут пераплёты — на другога б, слабейшага, можа і паддаўся б. Але на мяне... Ды што было, тое мінулася. Цяпер у нас брыгада— асы! Хлопцы адзін у аднаго. Як кажуць, звернуць чорту рогі і скажуць, што так і было.

Вунь яны сабраліся. Махаюць мне, бачыце? Гатова, значыць, зараз загудзе...

СЯДАЙЦЕ ДА НАС, таварыш карэспандэнт. Паслухайце, як Сяргей наш спявае. Артыст, ці ж не праўда? І голас прыемны, і ведае песень— не злічыш, і баянам валодае, як бог.

Зайздрошчу я здольным людзям, чэснае слова, зайздрошчу! І сам, праўда, на сцэну іншы раз вылажу, не глядзіце, што таўставаты ды не надта малады. «Яблычка» як сыпану, то паспрабуйце, адолейце. Зноў жа, байкі чытаю, спяваю... Але да Сяргея куды мне—саматужнік! Ён у нас, як жартуе той самы мой прыяцель-інжынер, гарманічна развітая асоба.

Жарты жартамі, а добра было б, каб такой асобай быў кожны чалавек. Мусіць жа будзе калі-небудзь, як вы мяркуеце? Гадоў праз дваццаць ці трыццаць? Па-мойму, дык будзе абавязкова!

От і сына свайго, Косціка, такім хачу пабачыць. І ўсіх яго равеснікаў. Ім праз дваццаць ці трыццаць столькі якраз і будзе, як нам з вамі цяпер. Самая, так сказаць, будзе апора і надзея камуністычнага грамадства.

Унь ён бегае па буравой, надзея камунізма. Дзён дзесяць не бачыліся, засумаваў. З суседам на спадарожнай прыехаў...

ЗАЛАЗЬЦЕ У КАБІНУ, таварыш, ехаць не блізка. І дарогі тут — пылу глытаняце. Калі спраўдзяцца нашы спадзяванні і пойдзе па белым свеце палеская нафта, дык мы тут такія пракладзём магістралі, — машыны, як ракеты, паімчаць!

Вы — на Мазыр, а я за вамі следам — на Ельск. Раз у тыдзень з сям'ёй і бываю. Сумнавата, вядома. Асабліва жонцы. Ды затое ўжо як прыязджаю, то дома як свята. Мо таму і не сварымся ніколі, а?

Дык я шафёру сказаў, каб з вамі да канторы. Парторга мо сёння шчэ застанеце. Трэба ж, каб ён знайшоў усё-ткі для вас чалавека цікавага ці гісторыю закручаную — для газеты ж! Не трэба, кажаце? Знайшлі ўжо? Каго?..

Уладзімір МЕХАЎ.

— Цяпер, сынок, наша буравая будзе далёка, вунь у тым баку! — гаворыць Хабараў дарагому госцю — сыну.

...А дзесьці там, за рамкамі здымка, ёсць чалавек, які аддае «чужым дзецям» не толькі частку свайго заслужанага адпачынку і сваёй энергіі — сваё сэрца. Канстанцін Іванавіч Акуловіч — пенсіянер. Дзіцячы сад на грамадскіх асновах, які арганізаваў ён пры дваццатым домакіраўніцтве горада Мінска, — справа добрых рук прыгожага і добрага чалавека.

Фота Ул. КРУКА.

ДЗВЕ ВІЗІТНЫЯ КАРТКІ

А. УЛАДЗІМІРАВА

ХТО СКАЗАЎ, што турысты—самы рухомы і дасціпны народ на белым свеце? Чым больш гляджу я на дваіх турыстаў з Амерыкі — Параску і Івана Сцяфураў, маці і сына, тым больш пераконваюся, што гэта не заўсёды так. Турыст турысту не роўны. Маці і сын вось ужо каторую гадзіну ў Брэсце, у першым савецкім горадзе, а ўсё яшчэ далей прывакзальнай тэрыторыі не адыходзяцца. Нават не верыцца, што некалькі сутак назад на самалёце дацкай авіякампаніі яны пераляцелі акіян, а сёння прыехалі на міжнародным экспрэсе з Варшавы, каб паглядзець на радзіму сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў, пазнаёміцца з жыццём і норавамі свайго адзінакроўнага народа. Вось прайшліся па пероне, пасядзелі на лавачцы ў скверыку, зноў прайшліся, зноў прыселі, раз-пораз пазіраючы на гадзіннік: ці хутка цягнік павязе іх далей, па маршруце... А можа гэта не толькі адсутнасць цікаўнасці, можа што небудзь іншае?

Таварышы з агенцтва «Інтурыст», якія пазнаёмілі мяне з Параскай і Іванам, загадзя папярэджвалі:

— Наўрад ці атрымаецца ў вас шчырая гутарка... Нечым гэтыя людзі вельмі напалоханы.

Хутка давялося пераканацца ў абсалютнай справядлівасці гэтых слоў. Інцыдэнты, што адбываліся на маіх вачах, можна было б назваць забаўнымі, калі б не былі яны такія сумныя. Сядзелі мы на лавачцы ў парку культуры, размаўлялі паціху, наколькі дазваляла нам разумець адзін аднаго самая неверагодная сумесь рускай, украінскай, польскай, беларускай і англійскай моваў. Раптам амерыканская турыстка ўскочыла, трывожна азіраючыся навокал:

— Дзе гэта страляюць?

Прыслухаліся. Аказваецца, непадалёку дзеці гулялі ў настольны тэніс, гулка ляпаючы ракеткамі. І ўжо зусім у паніцы ўцякала яна, калі, прыадчыніўшы дзверы прывакзальнага пакоя адпачынку, убачыла дзвюх жанчын — дзяжурных адміністратараў у белых халатах. Хто ведае, якія прывіды памроіліся ёй у гэты момант, якія ўспаміны ці асацыяцыі выклікаў гэты малюнак. «Падрыхтовачка» перад паездкай у Савецкі Саюз недзе там была праведзена, напэўна, даволі эфектыўна.

Такая ж насцярожанасць увесь час праяўлялася і ў размовах. Скажа што-небудзь жанчына і тут жа замоўкне, задумаецца, быццам правярае сябе па нейкім нябачным кандуіце: ці не сказала чаго-небудзь лішняга. Аднойчы ўсё ж нябачная інструкцыя была парушана. Параска расказвала, што ў прыгарадзе Нью-Йорка — Каксакі, дзе яны жывуць, у іх ёсць невялічкі «бізнес», яны прадаюць піва ў паўпадвальным памяшканні свайго дома. Сыны Іван і Міхал гандлююць, а яна займаецца гаспадаркай.

— І як ідзе ваш гандаль?

— У апошні час не вельмі. Людзі не маюць працы, няма за што купляць.

Сказала і тут жа спалохалася не на жарт. Пачала апраўдвацца:

— Усюды ж ёсць такія, што не хочуць працаваць. У вас жа таксама?

— У нас няма беспрацоўных.

— Ну, не кажыце, такога не можа быць.

І таямніча ўсміхнулася: разумею, маўляў, прапаганда ці таксама асцярожнасць, але дазвольце застацца пры сваёй думцы. Што ж, маршрут Параскі Сцяфуры і яе сына яшчэ толькі пачынаецца. Паездзяць, паглядзяць, падумаюць — там будзе відаць.

Угаварыўшы сваіх новых знаёмых пагуляць па горадзе, пазнаёміцца з Брэстам, тым самым я ўзяла на сябе добраахвотна ролю гіда. Што і казаць, я старалася выканаць яе як мага добрасумленна. Толькі праз якіх паўгадзіны настрой мой спаў ужо, адчувала, што мае турысты не надта што цікавяцца горадам, яго гісторыяй, яго жыццём. Слухаюць больш дзеля ветлівасці. Маці яшчэ туды-сюды, а сын ішоў за намі следам з такім выглядам, быццам на твар яго нехта паставіў гербавую пячатку з надпісам: мне ўсё роўна. Усё роўна — ісці ці сядзець. Можна ісці, а можна і пасядзець. Можна паглядзець, што гэта там за парк такі, а можна зноў павярнуць да вакзала. Як сабе хочаце. Брэсцкая крэпасць? Не чуў. Раскажаце — буду ведаць. Не раскажаце — не буду. Усё роўна. Вуліца Адама Міцкевіча? «Ноу, не ведаю, хто такі...» «Хочаце ведаць?» «Усё роўна...»

Захацелася дапытацца, ці ёсць што-небудзь на зямлі, што ўсё ж падабаецца гэтаму юнаму стоіку, што здольна ажывіць яго даволі прыгожыя, атрыманыя ў спадчыну ад маці-украінкі вочы. Далейшая наша размова выглядала прыкладна, так. Прашу маці, каб яна запыталася ў сына, ці думае ён вучыцца далей, ці ёсць якая-небудзь прафесія, спецыяльнасць, якую ён хацеў бы набыць. Маці перакладае.

— Ноу! — адказвае сын.

— Сказаў, што вучыцца не хоча...

— Можа ён збіраецца ажаніцца, завесці сям'ю? — спрабую пажартаваць.

Зноў ідзе пераклад. І зноў кароткае, нават не «ноу», а проста «но», гук, якім у нас звычайна паганяюць коней. Без ценю ўсмешкі, без усякай рэакцыі на жарт.

— А што любіць ваш сын, што яму падабаецца? Кнігі, музыка, тэатр, кіно, спорт, танцы?..

— Ес, ес, кіно, футбол, дансінг... — паўтарае за мною без асаблівага энтузіязму жанчына.

— Ес. Футбол, дансінг... — упершыню станоўча ківае галавою Іван усё так жа, без асаблівага энтузіязму.

На хвіліну мільганула думка: а можа ўся гэтая абыякавасць проста поза, проста такая манера паводзіць сябе, прынятая за эталон сярод маладых людзей яго асяроддзя і ўзросту? Ён жа вучыўся, закончыў каледж, нешта ж закінулі і ў яго душу настаўнікі, нейкае хай сабе хоць падабенства жыццёвых ідэалаў, імкненняў. Не можа ж хлопец з такімі разумнымі вачыма быць зусім, начыста абыякавым да жыцця, да людзей, да ўсяго, што адбываецца навокал. У чым жа тут сакрэт?

Яго раскрыла сама маці, раскрыла міжволі (зноў парушыўшы ўсё тую ж нябачную інструкцыю) у сваім наіўным мацярынскім імкненні згладзіць нейкім чынам непрыемнае ўражанне, якое, адчувала, зрабіў сын на старонняга чалавека.

— З палавіны восьмай раніцы да палавіны першай ночы Іван стаіць за прылаўкам, гандлюе півам... Яму няма калі займацца чым-небудзь іншым. Ён у нас замяняе цяпер бацьку.

Я ўжо ведала, што бацька яго, муж Параскі, памёр зусім нядаўна. Памёр ад хваробы — «як яна называецца? Цукар, ці што...» Адмовіўся ад аперацыі, хоць ведаў, чым гэта пагражае... І перад смерцю загадаў жонцы выканаць яго апошнюю волю, з'ездзіць на радзіму, у Закарпацце, туды, адкуль яго і Параску некалі маленькімі дзецьмі бацькі звезлі ў Амерыку... Няхай з'ездзіць, паглядзіць, як там жывуць на роднай зямлі сваякі.

— Вось я і паехала. Выконваю волю свайго гасбен... як гэта паруску? Мужа.

— А Іван? Ён таксама выконвае волю бацькі?

— Ён едзе са мною дзеля кампаніі. Адной боязна.

Дзеля кампаніі... і толькі? Няўжо яму не хацелася пабачыць радзіму сваіх бацькоў, няўжо нішто тут не можа знайсці водгук у душы гэтага хлопца, якога, няхай сабе толькі па дакументах, але завуць усё ж Іванам?.. Але вось мы падышлі да помніка воінам Вялікай Айчыннай вайны, што стаіць у Брэсцкім парку, я чытаю надпіс на помніку, маці перакладае: «Вечная слава героям, якія загінулі...» Джон, тут, як сабе хочаце, не магу назваць яго Іванам, неахайна паставіў нагу на п'едэстал, крышку патупаў па месцы і адышоўся ў бок, так і не даслухаўшы да канца. Зноў яму было «ўсё роўна!»

...Сустрэча, аб якой я расказала, была самай чыстай выпадковасцю. Яе нельга было ні прадбачыць загадзя, ні запланаваць нейкім чынам расказ аб ёй на старонках газеты. І ўсё ж ёсць у гэтай выпадковасці свая заканамернасць, свой сэнс.

У Брэсце я таксама была праездам, як і турысты з Амерыкі, толькі маршрут мой быў куды карацейшы. Праз некалькі гадзін мяне чакала паездка ў Жабінку, у тутэйшую школу-інтэрнат. Тры гады назад, калі школа яшчэ толькі пачынала сваё жыццё і сюды бацькі прывозілі з Брэста, Баранавіч, навакольных раённых цэнтраў і вёсак дзяцей, мне давялося ўжо там пабываць. Прызнаюся, у гэты час я шчыра любавалася абліччам маладога дырэктара гэтай школы, Пятра Мікалаевіча Іванцова. Яго абліччам і чалавека і педагога — хаця хіба можна падзяляць такія рэчы? Сам чалавек высокай культуры, Пётр Мікалаевіч захапляецца жывапісам, музыкай, літаратурай. Ён адразу ж з першых дзён жыцця школы паставіў мэту: новая навучальная ўстанова такога тыпу, як школа-інтэрнат, павінна даваць грамадству людзей гармаційна развітых. Ад эстэтыкі быту — да вяршынь чалавечай культуры, так, прыкладна, фармуляваўся лозунг, народжаны з першых дзён.

А як сёння, праз тры гады? Ці ёсць яшчэ порах у парахаўніцах выхавацеляў школы? Ці не згасла тое блакітнае полымя рамантыка ў вачах дырэктара, якім сапраўды нельга было не залюбавацца? А галоўнае, якімі ідуць у жыццё выхаванцы школы, гэтыя нашы маладыя сучаснікі? Чым узрадуюць яны свет, узбагацяць планету? Сучаснікі нашы і сучаснікі маладога амерыканца з рускім імем Іван. Амаль што яго адчагодкі... Грамадскія дзеячы і публіцысты самых розных палітычных адценняў і напрамкаў заўсёды дружна пагаджаліся ў адным: моладзь кожнай краіны — візітная картка будучыні гэтай краіны. Што ж, можна прыняць такую думку за аксіёму. Адну «візітную картку» мы толькі што навобмацак патрымалі ў руках.

А другая?

...Толя Пархута зайшоў у настаўніцкую, дзе мы гутарылі з завучам, выпадкова. Ён прыйшоў па сваіх інтэрнацкіх справах. Хлапец усяго на некалькі гадоў маладзейшы за Івана Сцяфуру. І я рашыла задаць яму тое ж пытанне, што і амерыканскаму юнаку:

— Чым ты захапляешся? Што больш за ўсё любіш?

— Больш за ўсё? Музыку! Не, напэўна, жываніс, а яшчэ—спорт. А яшчэ люблю рабіць канструкцыі мадэляў самалётаў і ракет. Падабаецца мне выпілоўваць рэчы з дрэва, таксама больш за ўсё...

Тры гады назад Толя не ведаў ніводнага нотнага знака. Цяпер ён па сутнасці стаў першым капельмайстрам школы. Вельмі добра іграе на баяне. Любіць пейзажны жываніс, сам спрабуе рабіць замалёўкі.

А мінулым летам яго, як пераможцу рэспубліканскага конкурсу фотааматараў (таксама адно з яго самых моцных захапленняў) пасылалі ў Артэк. Там былі падлеткі з розных краін свету — з Індыі, Балгарыі, Кубы, Алжыра. Толя набыў сярод іх многа новых сяброў, перапісваецца амаль што з палавінаю свету. Учора атрымаў пісьмо ад дзяўчынкі з Дэлі, сёння — ад юнака з ГДР... А яшчэ прывёз Анатоль з Артэка крышку сваіх першых уласных палітыка-псіхалагічных, калі так можна сказаць, назіранняў.

— Ведаеце, нас страшэнна здзіўляла, што дзеці з капіталістычных краін літаральна за ўсё, за ўсякую дробязь прапаноўвалі грошы. Падыдзе, папросіць мячык пагуляць і адразу ж працягвае манету...

Гляджу на Толю Пархуту, на яго твар, твар пятнаццацігадовага падлетка, поўны спакойнай годнасці чалавека, якому вельмі многае патрэбна ўбачыць і зрабіць на зямлі, і ўспамінаю той непагодлівы лютаўскі дзень тры гады назад, калі гэты ж хлопчык упершыню апынуўся тут, у школе-інтэрнаце. Я бачыла, як прывёў яго з вакзала загадчык навучальнай часткі Дзмітрый Якаўлевіч, ён быў пахмурны і не вельмі ветлівы — сумаваў: дома засталася маці. Толя нарадзіўся пасля вайны, і ўсё ж і на яго лёс вайна здолела пакласці свой змрочны цень. Бацьку аднойчы на фронце моцна прыціснула артылерыйскай гарматай, ён хварэў і памёр, калі Толя быў яшчэ зусім маленькі. Маці прайшла праз жахі Асвенціма, а цяпер часта хварэе і таму яна аддала сына ў школу-інтэрнат.

Маці часта прыязджае да Толі ў госці. Калі гэта выпадае вясною, абавязкова прывозіць невялічкі букет ландышаў Пятру Мікілаевічу Іванцову. Кветкі настаўніку — за спакойныя і разумныя вочы сына, а яшчэ таксама за тое, што многае на свеце ён любіць «больш за ўсё»...

ЛЕТАПІСЦЫ ВЯЛІКАГА ЧАСУ

МАГІЛЁЎСКАЯ АБЛАСНАЯ ФОТАВЫСТАЎКА

Ёсць на выстаўцы фотааматараў Магілёўшчыны адна невялічкая работа. Зірнеш на яе — быццам нічога асаблівага не ўбачыш: па чыгуначным палатне ідзе чалавек, перакінуўшы праз плячо няхітрыя прылады пуцявога абходчыка. Але ў гэтым простым, здавалася б, сюжэце—нямала тых добрых рыс майстэрства, якімі ў асноўным і адрозніваецца мастацкая фатаграфія ад рамесніцкага вырабу.

Аўтар работы «Шляхі-дарогі» (так называецца здымак) рэнтгенатэхнік чыгуначнай паліклінікі станцыі Магілёў Адам Рагоўскі выбірае ў героі сваіх фотакарцін людзей сціплых і працавітых. Яго пуцявы абходчык не мае той штампаванай усмешкі, якая вандруе з аднаго газетнага здымка на другі, тут няма і таго шырокага кроку, якім многія, нават спрактыкаваныя фотамайстры імкнуцца падкрэсліць імклівы поступ нашага часу. Чалавек ідзе спакойна. На твары яго глыбокі роздум. Ці не аб сэнсе жыцця на зямлі задумаўся гэты маршчыністы, трошкі ссутулены чалавек?

Тонкім псіхолагам зарэкамендаваў сябе і фотааматар Аляксандр Бязручанка. Яго работа «Рыбак» не патрабуе ніякіх тлумачэнняў. Перад гледачом паўстае вобраз чалавека, апаленага сонцам, абветранага. І хаця аўтар паказвае нам яго з вудай у руках,—гэта не проста рыбалоў—аматар пасядзець у цяньку ля рэчкі. Рыбак Бязручанкі—у першую чаргу чалавек працы, аб чым пераканаўча сведчаць яго натруджаныя, мазолістыя рукі. А хітраваты позірк светлых вачэй, накіраваных прама на гледача, выдае ў ім таго вясковага дзядулю, што не праміне ніводнага сходу, ніводнай гутаркі заезджага лектара і пры выпадку любіць паспрачацца аб міжнародным становішчы.

Удалых работ на сёлетняй абласной выстаўцы «Сямігодка ў дзеянні» нямала. Адчуваецца, што ў вобласці працуе даволі вялікі атрад аматараў мастацкай фатаграфіі. І адно з галоўных месц сярод іх займае фатографмастак Мікалай Жалудовіч.

Стэнд з работамі М. Жалудовіча вызначаецца надзённасцю тэматыкі, майстэрскай закончанасцю твораў. Аўтар умее знайсці для вырашэння той ці іншай тэмы самы адпаведны сюжэт, найбольш выразны ракурс.

Вось перад намі яго «Заводскія зарніцы». Нізка схіліўся над дэталлю электразваршчык. Сполахі аўтагену заліваюць незвычайна прыгожым святлом памяшканне цэха і сама постаць чалавека акрэсліваецца на гэтым фоне магутным і выразным сілуэтам.

А вось адна з буйнейшых новабудоўляў вобласці—Крычаўскі цэмента-шыферны камбінат. М. Жалудовіч знайшоў вельмі ўдалы пункт погляду на ўсе гэтыя магутныя краны, ажурныя перапляценні рыштаванняў.

Паказаў сябе Мікалай Жалудовіч і як здольны жанрыст. Ён смела бярэцца за самыя разнастайныя тэмы жыцця. На яго стэндзе можна сустрэць і хроніку спартыўнага жыцця, і будні калгаснай вёскі.

Як і ў мастакоў, у фотааматараў ёсць свой любімы герой, свая тэматыка. Анатоль Борчык паказвае гледачу цэлую галерэю работ з жыцця мастацкай самадзейнасці і будняў музычнага вучылішча, а Вадзім Пятушкоў, Аляксандр Сідлераў і Мікалай Радзіёнаў адлюстроўваюць краявіды роднай Магілёўшчыны.

Пейзаж. Здавалася б, чым могуць узрадаваць гледача работы гэтага жанра? Але калі за справу бярэцца чалавек з тонкім адчуваннем прыроды, тады плёнам яго намаганняў з'яўляюцца такія цудоўныя па настроі работы, як «Лясная казка» Аляксандра Сідлерава і «Збянтэжанасць» Вадзіма Пятушкова.

І А. Сідлераў, і В. Пятушкоў—члены фотаклуба Магілёўскага завода пад'ёмна-транспартнага абсталявання. Памятаецца, як многа было размоў і спрэчак на адным з пасяджэнняў фотасекцыі пры абласной газеце наконт таго, што нельга ж бясконца займацца членам заводскага клуба адлюстраваннем краявідаў, маўляў, час ужо «перайсці да чалавека». Думкі, праўда, размяжоўваліся, трэба толькі радавацца, што ні В. Пятушкоў, ні А. Сідлераў не адмовіліся ад улюбёнай тэмы. Удумлівая і старанная работа іх прынесла станоўчыя вынікі: адна з работ А. Сідлерава экспануецца зараз на Усесаюзнай выстаўцы мастацкай фатаграфіі.

Радасна адчуваць, што рады аматараў мастацкай фатаграфіі на Магілёўшчыне растуць з году ў год. Калі на мінулай выстаўцы мы рэдка бачылі побач з прозвішчам аўтара слова «рабочы»,—удзельнікамі былі ў пераважнай большасці фатографы-прафесіяналы,—дык сёлета ў спісе экспанентаў можна знайсці токара і гандлёвага работніка, калгасніка і настаўніка, інжынера і артыста... Усё гэта не прыйшло само па сабе. Рашаючую ролю тут адыграла плённая дзейнасць фотасекцыі, якая была створана летась пры рэдакцыі абласной газеты.

Сіламі членаў фотасекцыі за апошні час былі арганізаваны ў Магілёве выстаўкі на тэмы аб ударніках і брыгадах камуністычнай працы, аб людзях, якія з кельмай у руках стаяць на рыштаваннях будоўляў сямігодкі, аб учарашнім і сённяшнім дні роднага горада.

Хочацца думаць, што сёлетняя выстаўка, багатая як па колькасці аўтараў, так і па колькасці работ, з'яўляецца толькі пераходным этапам у творчасці фотамастакоў Магілёўшчыны, што ў будучым яны парадуюць гледача яшчэ больш змястоўнымі, яшчэ больш багатымі выстаўкамі.

А. КАНДРУСЕВІЧ.

г. Магілёў.

«РЫБАК». Фота Аляксандра Бязручанкі. З магілёўскай абласной фотавыстаўкі «Сямігодка ў дзеянні».

Геаграфічнае побач

ЖЫВАЯ СЦЯНА

Іх трое: Уладзімір Голубаў, Эдуард Калота, Іван Буцэвіч. Жывуць яны ў калгасе імя Калініна Нясвіжскага раёна. Усе трое — дружыннікі. Пасля працоўнага дня, прышпіліўшы чырвоныя павязкі, яны выходзяць на вуліцу.

...Аднойчы ў выхадны дзень у вёску Панюцічы ўварваліся на матацыкле п'яныя хуліганы з суседняй вёскі Круты Бераг. Яны скіравалі свой матацыкл ў чародку дзяцей, якія гулялі на вуліцы.

Яшчэ момант — і быць бядзе... Але дружыннікі не разгубіліся. Рызыкуючы жыццём, яны стварылі жывую сцяну і перагарадзілі шлях хуліганам.

Катастрофы не адбылося. Але яна магла быць, калі б не сталі на шляху бяды дружыннікі.

ЧАРГОВЫ РЭЙС

Самалёт АН-10 рабіў чарговы рэйс з Мінска ў Свярдлоўск.

Машыну пілатаваў камандзір карабля Уладзімір Лысакоўскі. Хутка павінен быў паказацца Свярдлоўск, самалёт пачаў зніжацца. Раптам на вышыні 6.800 метраў пачуўся штуршок. Пасажырам здалося, што самалёт нырнуў у паветраную яму, але экіпаж адразу ацаніў небяспеку. Сапсаваўся кампрэсар аднаго з рухавікоў, матор выйшаў са строю, восьвось мог успыхнуць пажар.

Камандаванне прыняў камандзір падраздзялення Яфім Багданаў, які ляцеў разам з экіпажам. Лётчыкі зафлюгіравалі вінт матора, які выйшаў са строю, пусцілі ў ход супрацьпажарныя сродкі. Усё вырашалася ў лічаныя секунды, і экіпаж не страціў ніводнай з іх.

Самалёт добра прызямліўся ў Свярдлоўску. Развітваючыся з выйшаўшымі іх праводзіць падцягнутымі, ветлівымі лётчыкамі, пасажыры і не падазравалі, які подзвіг тыя толькі што зрабілі.

ВЫПАДАК У ДЫСПЕТЧАРСКАЙ

Дыспетчар Зіновій Дзінабургскі ў гэты дзень, як звычайна, знаходзіўся на вакзале. У яго абавязак ўваходзіць адпраўляць аўтобусы ў рэйсы.

Не мог Зіновій застацца раўнадушны, калі пачуў лаянку. Ён зрабіў заўвагу п'яному пасажыру, запрасіў яго ў дыспетчарскую. І тут Зіновій заўважыў, што з кішэні пасажыра вытыркае рэвальвер. Мільганула думка: «Такому нядоўга пусціць яго ў ход»... Але Зіновій не разгубіўся. Ён уключыў мікрафон, па якім звычайна аб'яўляюць пасадкі на аўтобус, назваў прозвішча дзяжурнага міліцыянера і прапанаваў яму зайсці ў дыспетчарскую. Усё астатняе адбылося ў адзін момант. Незнаёмца абяззброілі. Ён аказаўся мацёрым рэцыдывістам.

Нашы госці

ВЫДАТНЫ АНСАМБЛЬ

Слухаць ансамбль скрыпачоў Вялікага тэатра Саюза ССР — гэта значыць атрымліваць рэдкаснае задавальненне. З гэтым, напэўна, пагодзіцца кожны, хто прысутнічаў у зале Беларускай філармоніі на канцэртах праслаўленага калектыву.

Ансамбль скрыпачоў пад кіраўніцтвам Ю. Раентовіча, вядомы далёка за межамі нашай Радзімы, валодае вялікім выканаўчым майстэрствам. Гэтае майстэрства прымушае радавацца і здзіўляцца таму энтузіязму, з якім працуюць артысты Вялікага тэатра. Спецыфіка опернага рэпертуару не перашкаджае ім пераўвасабляцца ў камерных выканаўцаў высокага стылю. 16 галасоў ансамбля гучаць у суправаджэнні фартэпіяна як адзін голас неабсяжнага дыяпазону і поўны дзіўных тэмбравых фарбаў. Калектыў вылучаецца бездакорным строем, тонкім разуменнем жанра «ансамбль», веданнем нацыянальных музычных стыляў. У яго выкананні цалкам захоўваюцца адметныя рысы італьянскай узвышанай кантылены, славянскага прастадушнага распеву, французскай вытанчанасці, іспанскай палымянасці.

Ансамбль выконвае творы старадаўніх італьянскіх майстроў, класікаў і рамантыкаў XVIII і XIX стагоддзяў, украінскія народныя песні і творы савецкіх кампазітараў.

Канцэрт рэ-мінор Баха (у арыгінале напісаны для дзвюх скрыпак) выконваўся ў пералажэнні для ансамбля ў суправаджэнні Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР (дырыжор В. Катаеў). Філасофскі паглыбленая музыка гэтага канцэрта развіваецца па прынцыпу супастаўлення кантрасных частак. У ажыўленай першай частцы шмат святла і радасці, другая, лірычна паглыбленая, прымушае засяроджана задумацца, а трэцяя, з яе здзіўляючай глыбінёй гучання, прыводзіць да ўрачыстасці. Аднак поўнага ўражання слухач не атрымаў з-за трохі незвычайнай манеры дырыжыравання гэтым творам, якая нагадвала сцыль «брас». Гэта іншы раз парушала ансамбль салістаў і аркестра і прыводзіла да рытмічнай недакладнасці.

Арыя Гендэля ў тым жа выкананні прагучала больш ярка, натхнёна і памайстэрску, асабліва яе шырокі распеў і адзіная драматычная лінія.

З сольнай праграмы, выкананай калектывам скрыпачоў, запомнілася вельмі многае: Варыяцыі на 24 капрыс Паганіні, «Навара» Сарасатэ, «Палёт чмяля» Рымскага-Корсакава, «Аве Марыя» Шуберта, «Лебедзь» Сен-Санса, Раманс Шастаковіча, Вальс з оперы «Вайна і мір» Пракоф'ева і яго «Шэсце» з сімфанічнай казкі «Пеця і Воўк», «Румынскі карагод» Дзініку і іншыя творы. Музыка ў пералажэнні для гэтага ансамбля гучыць як у арыгінале.

У гэтых жа двух канцэртных вечарах удзельнічала салістка Вялікага тэатра Саюза ССР, заслужаная артыстка РСФСР, лаўрэат міжнародных конкурсаў ваналістаў Г. Алейнічэнка. Лірыка-каларатурнае сапрана спявачкі вызначаецца прыемным тэмбрам, гукавой свабодай і роўнасцю. Артыстка валодае віртуознай тэхнікай выканання і высокім майстэрствам інтэрпрэтацыі. Уключаныя ёю ў гастрольны рэпертуар творы Бізэ, Дэліба, Дэбюсі складаюць нібы адно цэлае з рэпертуарам ансамбля скрыпачоў. Нават сцэна спакусы з оперы «Манон Масэ» і арыя Віялеты з оперы «Травіята» Вердзі або вальс Мюэтці з оперы «Багема» Пучыні не парушылі камернага стылю канцэртнай праграмы. З асаблівым натхненнем выканала Г. Алейнічэнка раманс Дэбюсі «Цень», арыю Віялеты, украінскую народную песню «Салавейка». Вялікая доля поспеху належыць яе вопытнаму і чуламу канцэртмайстру В. Томінай.

Трэба сказаць, што маладая спявачка шукае шляхоў да больш глыбокага пераўвасаблення з аднаго вобраза ў другі, стараецца зжываць інтанацыйныя недахопы, якія іншы раз сустракаюцца пры выкананні вакальных твораў. Артыстка захапляе сваёй прывабнасцю, высокай выканаўчай культурай.

Два вечары натхнёнай музыкі ў канцэртнай зале нашай філармоніі надоўга запомняцца мінчанам.

В. СІЗКО.

З розных шыротаў

НА СТУДЫІ «МАНГОЛКІНО»

Вялікая творчая работа вядзецца калектывам работнікаў кінастудыі «Манголкіно». Закончан і хутка выйдзе на экраны краіны антырэлігійны фільм рэжысёра заслужанага артыста Мангольскай Народнай Рэспублікі Чымідосара і аператара Цэндэжава «Грахі і дабрадзейства» (па матывах апавядання Нацагдоржа «Слёзы ламы»). Фільм раскажа пра жыццё жанчыны ў дарэвалюцыйным Улан-Батары.

Заканчваюцца здымкі кінакамедыі «Ой, вы дзяўчаты!», якую ставіць выпускнік Інстытута кінематаграфіі рэжысёр Доржпалам па п'есе Ладайдамбы «Мне можна верыць».

Ідуць здымкі кінакамедыі «Губны гармонік», у якой расказваецца пра вялікае гарадское будаўніцтва ў рэспубліцы, пра перамогу новага над перажыткамі старога ў свядомасці людзей.

Хутка на экраны краіны выйдзе першая частка дакументальнага фільма аб будаўніцтве новага прамысловага раёна Манголіі Дархан (рэжысёр Дашдорж). Фільм пачалі здымаць у 1959 годзе, калі на месцы будучага горада быў голы стэп. У 1961 годзе была знята закладка першых аб'ектаў прамысловага раёна. Гэты фільм расказвае пра непарушную братнюю дружбу мангольскага і савецкага народаў.

Усяго ў гэтым годзе студыя «Манголкіно» выпускае на экраны чатыры мастацкія фільмы, 24 часопісы кінахронікі, некалькі дакументальных фільмаў.

НЯМА ГЛЕДАЧОЎ

Сур'ёзныя цяжкасці перажываюць заходнеберлінскія кінапрадпрыймальнікі. Многія ўласнікі кінатэатраў абанкручваюцца. Наведванне заходнеберлінскіх кінатэатраў за апошнія шэсць гадоў рэзка знізілася. Як паведаміў газеце «Вельт ам зонтаг» кіраўнік аб'яднання заходнеберлінскіх кінатэатраў Каман, колькасць гледачоў скарацілася з 62,5 мільёна ў 1956 годзе да 28,3 мільёна ў мінулым годзе, г. зн. больш, чым у два разы.

Адзін за другім закрываюцца кінатэатры. За апошнія два гады спынілі існаванне 62 кінатэатры з 260 кіназалямі. Каб не адштурхоўваць астатніх гледачоў відам пустых лавак, уласнікі кінатэатраў выкідаюць значную колькасць радоў. Многія памяшканні закрытых кінатэатраў выкарыстоўваюцца пад складскія памяшканні.

ЗАДУМА НЕ ЗНАЙШЛА ЎВАСАБЛЕННЯ

Нядаўна ў французскім горадзе Кане закончыўся Міжнародны кінафестываль. Францыя на ім была прадстаўлена фільмам «Бяздонне», пастаўленым Ніка Папатакісам. Тэмай фільма паслужыла сапраўднае здарэнне. Дзве маладыя служанкі помсцяць гаспадарам за бязлітасную хатнюю тыранію. У фінале фільма дзяўчаты забіваюць гаспадароў.

Як і трэба было чакаць, фільм «Бяздонне» з яго тэмай забойства і садызму не быў адзначан на фестывалі ніякай прэміяй. Вось што піша пра гэты фільм рэцэнзент французскага часопіса «Пуркуа па?».

Ніка Папатакіс фальшывы з першых кадраў, заяўляе аўтар рэцэнзіі. У фільме створана атмасфера крайняга гвалту, атмасфера памыйніцы, непрыстойнасці, істэрычнага ляманту. Увесь гэты фізічны і слоўны гвалт толькі раскрывае непапраўную бездапаможнасць аўтараў.

Прыгнечаныя, прысутнічалі мы на гэтым блазенскім фільме, піша далей рэцэнзент. Пастаянныя перабольшанні прывялі толькі да таго, што мы страшэнна пазяхалі. Наўрад ці які-небудзь іншы фільм так яўна паказваў розніцу паміж задумаю і вынікам, калі наогул можна назваць задумаю гэтую рэжысуру, якая праводзілася пад знакам таямнічасці, пераўвелічэння, глупства і снабізму.

Па матэрыялах карэспандэнтаў ТАСС.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКАЛЬ, І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА
на другое паўгоддзе 1963 года
НА РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ГАЗЕТУ
«ЗВЯЗДА»
ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ, ВЯРХОЎНАГА САВЕТА І САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР
Падпіску прымаюць без абмежавання ўсе раённыя, гарадскія канторы, аддзяленні сувязі, аддзелы «Саюздруку», калгасныя паштальёны і грамадскія распаўсюджвальнікі друку на прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах, саўгасах.
Падпісная цана:
на шэсць месяцаў — 3 рублі,
на тры месяцы — 1 руб. 50 кап.
ТАВАРЫШЫ РАБОЧЫЯ, КАЛГАСНІКІ І СЛУЖАЧЫЯ, ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА «ЗВЯЗДУ»!

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.
НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-22-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-22-04, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03
«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.
Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 10297